ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

«Першую сукенку пашыла ў 11»

Шлях у акадэмікі

Гульня на выбыванне

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына АКУЛОВІЧ, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

«Пры рэалізацыі Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» важная магчымасць індывідуальнага падыходу. Дэкрэт накіраваны на папярэджанне сацыяльнага ўтрыманства і мае на ўвазе двухбаковы рух: грамадзяне імкнуцца працаўладкавацца самастойна, але і новыя працоўныя месцы павінны стварацца, праводзіцца перанавучанне. Вельмі важна, што нядаўна ўнесеныя ў дэкрэт змены далі магчымасць мясцовым органам улады разбірацца ў жыццёвых сітуацыях людзей, якія засталіся без працы, і, пры неабходнасці, вызваляць іх ад выплаты збору».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.02.2017 г.

Долар ЗША	1,8650 ▼
Еўра	1,9716 ▼
Рас. руб.	0,0328 ▲
Укр. грыўня	0,0691 ■

ISSN 1990 - 763X
17032
9 771990 763008

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЛЮТАГА 2017 г. ЧАЦВЕР № 32 (28396)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ На варце Айчыны

НАДЗЕЙНЫ ЗАПАС

Фота БЕЛТА.

Вучэнне з сіламі тэрытарыяльнай абароны прайшло на палігоне ў Смалявіцкім раёне. На здымку: сяржант Дзяніс ЛЯПУШКІН.

СТАР. 3

■ Камень спатыкнення

ЦІ ПАТРЭБНЫЯ ЗАВОДЫ Ў ЖЫЛЫХ РАЁНАХ?

І НАВАТ У МЕЖАХ ГОРАДА ...

Навукоўцы гавораць пра пераход да постындустрыяльнага грамадства, але новыя вытворчасці па-ранейшаму з'яўляюцца, у тым ліку і ў буйных гарадах. І калі эканамічны рост гараджане з радасцю вітаюць, то магчымае пагаршэнне экалагічнай сітуацыі ўспрымаюць у штыкі, асабліва калі гаворка заходзіць аб спальных раёнах. Мы, на прыкладзе сталіцы, паспрабавалі разабрацца: быць або не быць вытворчасцям у горадзе?

«А я лічу, што забруджвае. І кропка!»

Асабліва гарачыя спрэчкі на гэтую тэму разгарэліся вясной мінулага года, калі на грамадскае абмеркаванне быў вынесены праект забудовы прамысловай зоны каля лесапарку Мядзвежына, што паблізу мікрараёна Сухарава. Тады на адміністрацыю Фрунзенскага раёна ў літаральным сэнсе абрынуўся шквал заяў жыхароў раёна, якія выступілі катэгарычна супраць рэалізацыі праекта. Тым не менш было прынята канчатковае рашэнне: будаўніцтву быць! У адміністрацыі растлумачылі, што вытворчасць будзе абсалютна бяспечнай, а абурэнне жыхароў пакіпела-пакіпела і сціхла. Мы вырашылі высветліць, як выглядае сітуацыя практычна праз год.

Зімовым днём ў лесапарку Мядзвежына ціха і спакойна. Цалкам прадказальна, асноўная доля тых, хто выйшаў на шпацыр, прыпадае на маладых мам з каляскамі, кампанію якім складаюць хіба што пажылыя людзі і гаспадары сабак. Нарэзаўшы некалькі кругоў па парку, вырашыла загаварыць з жанчынай, якая захоплена чытае газету (хіба, знак!) і павольна пагойдвае ярка-бірузовую каляску.

СТАР. 4

■ Пераймай!

КАМІНАР З ПАЖАРНАГА ЗАВУЛКА

Змагацца з няшчаснымі выпадкамі бабруйскім ратавальнікам дапамагае... прывід

Дзмітрый СКАЗАЎ і Уладзімір БУТКО прыдумалі Тушылкіна, каб меней было няшчасцяў.

Бабруйск — горад асаблівы, гэта адзначалі яшчэ ў сваім славутым «Залатым цяляці» Ільф і Пятроў. Нават ратавальнікі тут не зусім падобныя на іншых — кіно здымаюць, карціны збіраюць і нават маюць свой прафесійны прывід. Кажуць, што як толькі ён з'явіўся, парадку стала больш. Думаеце, дзіцячыя гульні? Наадварот. Псіхалагічны прыём. Супрацоўнікі групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайаддзела па НС старшы інспектар Дзмітрый Сказаў і спецыяліст Уладзімір Бутко кажуць, што вельмі надакучыла чуць пра негатыў, звязаны з іх працай, — пажары, чалавечыя ахвяры... Таму вырашылі зрабіць стаўку на гульні і высокія матэрыі. Вядома, што на падсвядомым узроўні чалавек запамінае неабходную інфармацыю лепш, а значыць, бяда ніколі не застане яго знянацку.

СТАР. 15

■ Расклад на заўтра

НЕЛЬГА ПЕРАГРУЖАЦЬ НІ ДЗЯЦЕЙ, НІ ПАДРУЧНІКІ

«Пры распрацоўцы навучальных праграм нельга дапускаць пралікаў і памылак», — заявіў намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО на калегіі Міністэрства адукацыі, прысвечанай вынікам працы міністэрства за 2016 год і асноўным задачам на гэты год.

— Кіраўніком дзяржавы і ўрадам пастаўлена канкрэтная задача па сур'ёзным удасканаленні навучальнага працэсу ў агульнаадукацыйнай школе. І ў першую чаргу гэта датычыцца распрацоўкі новых вучэбных праграм. На думку педагогаў, сёння яны недасканалыя, перагружаныя, — растлумачыў Васіль Жарко. — Між іншым, вучэбныя праграмы павінны быць якаснымі, паслядоўнымі і ўзаемазвязанымі. Мною даручана міністру адукацыі стварыць працоўную групу па гэтым пытанні, прыцягнуць да работы над вучэбнымі праграмамі не толькі навукоўцаў, але і педагогаў-практыкаў.

Васіль Жарко праінфармаваў, што ў адпаведнасці з абнаўленнем навучальных праграм распрацоўваюцца і вучэбныя дапаможнікі. Да 2020 года, згодна з даручэннем Прэзідэнта, трэба цалкам абнавіць увесь спектр падручнікаў, зрабіць іх больш даступнымі, інфарматыўнымі і неперагружанымі. Для іх падрыхтоўкі на конкурснай аснове трэба прыцягваць самых лепшых спецыялістаў, выкарыстоўваць досвед іншых краін. «Падручнікі павінны быць якаснымі і служыць доўга, а не перапрацоўвацца кожны год, — дадаў віцэ-прэм'ер. — Гаворачы пра школу, не магу не закрануць тэму здароўя дзяцей. Грош цана ўсім нашым адукацыйным праграмам, калі кожны год стан здароўя дзяцей пагаршаецца. Таму распрацоўка новага пакалення і праграм, і падручнікаў павінна выключыць перагрузку дзяцей».

Намеснік прэм'ер-міністра ўпэўнены, што неабходны аб'ём ведаў для паступлення ў ВНУ вучань павінен атрымліваць у школе, а не ў рэпетытара. Між іншым, рэпетытарства распаўсюджана ўжо не толькі пры паступленні ў ВНУ, але і ў працэсе вучобы. Часта бацькі скардзяцца, што настаўнік не поўнасцю раскрывае свой прадмет, а для больш паглыбленага вывучэння адпраўляе



Фота Надзеі БУЖАН.

вучня да свайго калегі-рэпетытара. «Такія з'явы павінны жорстка спыняцца, — папярэдзіў Васіль Жарко. — Вучэбную праграму неабходна пабудаваць так, каб усё можна было асвоіць на працягу навучальнага года. Міністэрству адукацыі неабходна павярнуцца тварам да гэтай праблемы».

Агучыў Васіль Жарко і сваё бачанне цэнтралізаванага тэсціравання:

— Тэсціраванне з'яўляецца дастатковa справядлівым спосабам адбору, паколькі ўсе абітурыенты знаходзяцца ў роўных умовах. Але тэст не ўніверсальны, ён не дае магчымасць ацаніць логіку рашэння задачы, эрудыцыю, кругагляд абітурыента, яго грамадзянскую пазіцыю. Таму ўрадам даручана стварыць міжведамасную працоўную групу па гэтым пытанні і выпрацаваць аптымальныя прапановы. Магчыма, па некаторых прадметах мы вернемся да вусных экзаменаў...

Закрануў Васіль Жарко і выкананне настаўнікамі неўласцівых ім функцый: «Выклікае здзіўленне, калі школу абавязваюць прымаць меры да бацькоўскай або ВНУ, прыйшоўшы на прадпрыемства ці ў арганізацыю, не павінен даваўчвацца або перавучвацца, трэба быць гатовым адразу выконваць свае службовыя абавязкі ў адпаведнасці з атрыманай кваліфікацыяй. Інакш навошта мы трацім бюджэтныя сродкі і выпускаем непадрыхтаванага спецыяліста? Трэба значна ўзмацніць патрабаванні да падрыхтоўкі спецыялістаў — яна павінна быць практыкаарыентаванай», — упэўнены намеснік прэм'ер-міністра.

неплацельшчыкаў камунальных паслуг. Маўляў, гэта трывожны сігнал, што ў сям'і ёсць праблема, таму педагог павінен абследаваць яе і прыняць меры. А калі хто-небудзь з бацькоў здзяйсняе нейкае правапарушэнне, то школа таксама павінна правесці абследаванне сям'і і фактычна заняцца перавыхаваннем бацькоў. А чаму застаюцца ўбаку праваахоўныя органы, камісіі па справах непаўналетніх?»

Намеснік прэм'ер-міністра ўпэўнены, што школа і педагогі не павінны падмяняць іншыя структуры, яны павінны ўзаемадзейнічаць у гэтай працы ў рамках сваіх функцыянальных абавязкаў.

Таксама намеснік прэм'ер-міністра даручыў даць прававую ацэнку паслугам па напісанні курсавых і дыпломных работ для студэнтаў, прапановы якіх прадстаўлены на сайтах. Студэнты актыўна карыстаюцца такімі паслугамі. Аднак часта гэта нікога не бянтэжыць. У ВНУ не цікавяцца, кім выканана работа, галоўнае, што яна ёсць. «Аб якой якасці адукацыі мы можам гаварыць? Лічу, што неабходна праверыць гэтыя інтэрнэт-сайты і заканадаўча даць ім ацэнку, маюць яны права на жыццё ці не», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Васіль Жарко адзначыў, што павышэнне якасці прафесійнай падрыхтоўкі — задача нумар адзін. «Выпускнік установы прафесійна-тэхнічнай адука-

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■

Субота — дзень прамых зваротаў

Традыцыйныя стасункі жыхароў краіны з кіраўніцтвам рэгіёнаў працягнуцца 18 лютага, як заўсёды, з 9.00 да 12.00 на сувязі з беларусамі будзе мясцовая ўлада. У гэты час кожны зможа задаць пытанне, звярнуцца з ініцыятывай ці прыцягнуць увагу да якой-небудзь праблемы. На тэлефонныя званкі будуць адказваць:

Брэсцкі аблвыканкам
кіраўнік спраў НАРКЕВІЧ Юрый Іосіфавіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЖУК Ігар Георгіевіч (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам
кіраўнік спраў ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам
в.а. першага намесніка старшыні ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч (80172224444).

■ Міжнародныя адносіны

Бязвізавы рэжым можа быць прадоўжаны

Начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК адзначыў, што рашэнне аб гэтым будзе прымацца па выніках пяцідзённага тэрміну. Магчымасцю наведаць Беларусь у гэтыя дні ўжо скарысталіся амаль 500 іншаземцаў.

Калі такі рэжым застанецца запатрабаваным сярод гасцей Беларусі і дасць станоўчы эфект, можна будзе гаварыць пра працяг эксперымента. Дзмітрый Мірончык звярнуў увагу, што на гэта ўплываюць розныя крытэрыі і «ў залежнасці ад іх будзе прымацца рашэнне адносна далейшага ўдасканалення рэжыму бязвізавага ўезду. Хутчэй за ўсё гаворка будзе ісці пра прадаўжэнне тэрмінаў. Мы будзем заставацца ў рэжыме пропуску праз Нацыянальны аэрапорт Мінск, але на даўжэйшы тэрмін».

Адзін з варыянтаў — прадоўжыць бязвізавы рэжым на два тыдні. Санаторна-курортнае лячэнне — адна з «візітовак» Беларусі, таму для іншаземцаў прапанова сумясціць адпачынак, вандроўку і паляпшэнне здароўя магла б быць цікавай. 12 дзён — адзін са стандартных тэрмінаў знаходжання ў санаторыях. «Калі мы будзем рабіць наступны крок, то лагічна гаварыць пра 12 ці 14 дзён», — заявіў Дзмітрый Мірончык.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

Беларусь — Швейцарыя: 25 гадоў узаемаразумення

У мінскім Доме дружбы ўрачыста адсвяткавалі 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж гэтымі дзяржавамі. Тут сабраліся актывісты таварыства «Беларусь — Швейцарыя», прадстаўнікі парламента, Міністэрства замежных спраў, грамадскасці сталіцы.

Кіраўнік аддзялення Пасольства Швейцарскай Канфедэрацыі ў Беларусі Паскаль Эбішэр падвёў галоўныя вынікі супрацоўніцтва за гэты час. На яго погляд, за 25 гадоў удалося закласці трывалы падмурак для плённага супрацоўніцтва ў розных сферах. У выніку абедзве краіны наладзілі не толькі сяброўскія стасункі, але і паспяхова ўзаемадзейнічаюць у эканоміцы. Паскаль Эбішэр сказаў, што ёсць нямала прыкладаў гэтага паспяховага супрацоўніцтва. У першую чаргу ён назваў швейцарскае прадпрыемства «Штадлер Мінск», якое ўяўляе сабой удалы і перспектыўны ўзаемавыгадны праект. Усяго ў Беларусі працуе каля 140 прадпрыемстваў са швейцарскім капіталам.

У сваю чаргу начальнік упраўлення Еўропы МЗС Беларусі Яўген Вараб'ёў падкрэсліў, што Беларусь і Швейцарыя не маюць глабальных амбіцый, але пры гэтым паслядоўна супрацоўнічаюць у палітыцы і эканоміцы. Дыпламат звярнуў увагу на сувязі ў гуманітарнай сферы. Ён, у прыватнасці, згадаў і падзякаваў швейцарскім сябрам за дапамогу ў аздараўленні беларускіх дзяцей з тэрыторый, якія пацярпелі ад Чарнобыля.

Леанід ТУГАРЫН

■

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Рэйтынг Меркель на 1% вышэйшы за ўзровень даверу Шульцу

Інстытут саццаследаванняў Forsa па выніках апытання, праведзенага па заказе часопіса Stern і тэлерадыёкампаніі RTL, высветліў, што канцлер Германіі Ангела Меркель па папулярнасці сярод жыхароў краіны на 1% абганяе экс-кіраўніка Еўрапарламента, аднаго з кандыдатаў на пасаду канцлера Марціна Шульца.

Як сцвярджаюць аўтары даследавання, калі б прамыя выбары канцлера Германіі адбыліся зараз, то 38% жыхароў краіны прагаласавалі б за Меркель і 37% — за Шульца, перадае РІА «Навіны».

Такім чынам, за тыдзень рэйтынг Меркель вырас на 1%, падтрымка Шульца засталася на тым жа ўзроўні.

Выбары ў бундэстаг адбудуцца 24 верасня.

Магерыні заявіла пра магчымую страту Злучанымі Штатамі ролі сусветнага лідара

Такую заяву кіраўнік дыпламатыі Еўрапейскага саюза Федэрыка Магерыні зрабіла па выніках візіту ў Вашынгтон.

Дыпламат сцвярджае, што раней ні разу не бачыла ЗША такімі палярызаванымі, падзеленымі і абцяжаранымі канфліктамі, як цяпер.

«Той, хто хоча гуляць ролю сусветнага лідара, павінен быць унутрана моцным, упэўненым у сабе і згуртаваным», — дадала Магерыні ў інтэрв'ю Еўрапейскаму альянсу вядучых перыядычных выданняў.

Па словах кіраўніка дыпламатыі, калі «найвялікшая дэмакратыя ў свеце» сутыкаецца з такімі выпрабаваннямі, гэта можа стаць дэстабілізуючым фактарам для ўсяго свету.

Таксама Магерыні заявіла, што ЗША не павінны ўмешвацца ў еўрапейскую палітыку, гэтак жа як і Брусель не ўмешваецца ў палітыку ЗША, перадае ТАСС.

У Вільні занепакоіліся наконт рэзкага падзення колькасці насельніцтва рэгіёнаў Літвы

Дэмаграфічныя перспектывы Літвы палохаюць — ужо ў 2021 годзе ў літоўскія ВНУ паступіць на чвэрць менш выпускнікоў школ, чым цяпер, акрамя таго, зніжаецца колькасць жыхароў у рэгіёнах, адкуль людзі з'язджаюць у Вільню і Коўна, паведамляе Цэнтр назірання за навукай і аналізу краіны.

«Гэта палохае — расце колькасць жыхароў, старэйшых за 60 гадоў, а колькасць моладзі ва ўзросце 10—20 гадоў скарачаецца. Такі дэмаграфічны крызіс падзейнічае на сістэму адукацыі. Пазней крызіс закране і рынак працы», — сказаў эксперт цэнтра Гінтаўтас Якштас.

У Літве існуе праблема не толькі ўнутранай міграцыі з рэгіёнаў у сталіцу. Так, мясцовая прэса піша пра масавую эміграцыю з краіны — кожны дзень за межы краіны з'язджае каля 100 чалавек.

Міністэрства аховы здароўя РФ прапанавала павялічыць працоўны дзень для курцоў

Міністэрства аховы здароўя Расіі прапанавала даць магчымасць працадаўцам павялічыць працоўны дзень для тых супрацоўнікаў, якія курацьь. Пра гэта гаворыцца ў антытытунёвай канцэпцыі Міністэрства аховы здароўя на 2017—2022 гады.

У канцэпцыі гаворыцца, што час працы павінен быць павялічаны «прапарцыянальна часу, патрачанаму ім (работнікам) на курэнне тытуню на працягу працоўнага дня». Акрамя таго, у канцэпцыі Міністэрства аховы здароўя Расіі было прапанавана ўвесці забарону на продаж тытуню грамадзянам, якія нарадзіліся пазней за 2014 год. Ведамства прапанавала забараніць ім продаж тытунёвых вырабаў нават па дасягненні імі паўналецця.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Гамезу Валерыю Валяр'янавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Гісторык Сяргей ТРАЦЦЯК:

«Цяпер стала модна быць беларусам»

Гісторыя незалежнай Беларусі сёння мала даследавана. Неабходна вывучаць тое, што адбываецца, аднак пакуль не ўдаецца ахапіць усе аспекты гістарычнага працэсу. Загадчык аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей ТРАЦЦЯК растлумачыў, з чым гэта звязана, а таксама расказаў аб актуальных праблемах і тэндэнцыях у гэтай галіне ведаў.

— Сяргей Аляксандравіч, якія аспекты гісторыі сучаснай Беларусі мала вывучаны і патрабуюць дапрацоўкі?

— Справа ў тым, што ў гісторыі сучаснай Беларусі — а менавіта пасля 1991 года — падрабязнага вывучэння патрабуюць практычна ўсе яе аспекты. Аднак час для непрадузятага вывучэння сучаснасці Беларусі яшчэ не прыйшоў. Тое, што робіцца цяпер, — гэта спробы асэнсаваць гісторыю незалежнай Беларусі ў першым набліжэнні. У першую чаргу гэта работы, у якіх навукоўцы спрабуюць прымяніць новыя метадалагічныя падыходы да даследавання пэўных праблем і працэсаў. Аднак цэласнай карціны мінулага яны не даюць. Па-другое, на вельмі многіх работах, якія прысвечаны беларускай сучаснасці, ляжыць адбітак метадалагічнай эклектычнасці — механічнага змешвання розных метадалагічных падыходаў і школ. Навукоўцы спрабуюць прытрымлівацца спадчыны савецкай гістарыяграфіі і прымяняць тое, што напрацавана ў гістарыяграфіі заходніх краін.

— Якія найбольш важныя даследаванні праводзіліся за апошнія гады?

— У мінулым пяцігоддзі гісторыкамі нашага інстытута, а канкрэтна — гісторыкамі аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці, была выдадзена фундаментальная праца «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», а ёй папярэднічаў «Нарыс беларускай дзяржаўнасці ў XX стагоддзі». У цяперашні час да выдання рыхтуецца пашыранае і дапоўненае трохтомнае даследаванне, але ўжо на рускай мове. Галоўная выснова з гэтай фундаментальнай працы такая: дзяржаўнасць — гэта не толькі неад'емнае права народа на тое, каб валодаць сваёй дзяржавай, але і здольнасць нацыянальнай эліты рэалізаваць гэта права на практыцы. У гісторыі Беларусі былі як гістарычныя формы дзяржаўнасці, так і нацыянальныя. І іх нельга змешваць, таму што нацыянальная дзяржаўнасць — гэта прадукт цалкам канкрэтнай эпохі мадэрн, якая прадэманстравала нацыянальную дзяржаву ў дзвюх разнавіднасцях — буржуазнай і сацыялістычнай. Дзяржаўнасць не падае з неба, за яе трэба змагацца, а таксама абараняць.

— Якія праекты хацелася б рэалізаваць у будучыні?

— Ужо каторае дзесяцігоддзе кажуць, што патрэбна новая шматтомная гісторыя Беларусі, якая б асвяціла на новым гістарычным узроўні ўвесь шматтысячагадовы шлях беларусаў — ад з'яўлення людзей на беларускай зямлі і да сучаснасці. Даўным-даўно наспела неабходнасць падрыхтоўкі і выдання абагульняючай працы пра гісторыю Беларусі ў перыяд незалежнасці. У рэшце рэшт, у мінулым годзе мы адзначылі 25 гадоў незалежнасці. Перыяд немаленькі, за гэты час узнікалі і гінулі цэлыя дзяржавы, якія паспявалі пакінуць пасля сябе велізарныя масівы гістарычных прац, але ў Беларусі пакуль што падобнага даследавання няма.

МОДА НА БЕЛАРУСАЎ

— Сёння беларуская культура становіцца папулярнай у грамадстве: людзі гавораць па-беларуску, носяць вопратку з нацыянальнымі ўзорамі. Чаму гэта адбываецца?

— Беларусы складаюць 83% насельніцтва краіны і з'яўляюцца тытульным этнасам, які даў імя дзяржаве. Культура беларускага этнасу і пры дапамозе дзяржавы, і ўласным шляхам становіцца падмуркам масавай культуры сучаснага беларускага грамадства. Цяпер стала модна быць беларусам. Дваццаць пяць гадоў незалежнасці ўсё-такі далі нашаму народу ўсведамленне таго, што мы — асобны народ, самастойны і самабытны. У вялікае жыццё выйшла пакаленне, якое ніколі не жыло ў Савецкім Саюзе, а цяпер прыходзіць пакаленне, якое і нарадзілася ўжо пасля распаду СССР. Па вялікім рахунку, савецкая настальгія для такіх людзей — гэта не фантомны боль, а гістарычная экзотыка, частка мінулага, якое было і якое прайшло. Цяпер паўстаў запыт на нешта іншае, на сваё, якое і звязана з савецкім мінулым, але ўжо не савецкае. Да таго ж чым далей, тым больш дзяржавы былога Савецкага Саюза разыходзяцца ў розныя бакі. Яны становяцца самабытнымі. Так, ёсць агульная памяць аб савецкім мінулым, але ва ўсіх яна розная. Таму што людзі, якія жывуць у адным доме, успрымаюць гэтае жыццё па-свойму.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

■ Рэха падзеі

ПОДЗВІГ БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

Падчас урачыстага мітынгу ўшанавалі памяць загінулых у Афганістане

Быццам рака, якая ўпадае ў возера, натоўп людзей рушыў да вострава Мужнасці і Смутку, больш вядомага ў народзе як Востраў слёз. Адна за адной дэлегацыі ўскладалі вянкі, неслі кветкі ўжо сівыя мужчыны, раз-пораз прыкладаючы хустачку да вачэй. Жалобна крычалі чайкі — быццам смуткавалі разам з тымі, хто ў Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў прыйшоў сюды, каб ушанаваць памяць таварышаў, якія з афганскай вайны не вярнуліся...

Фота Надзеі БУЖАН.

— Сёння могуць быць розныя тлумачэнні тых падзей, але, я ўпэўнены, нас усіх перапаўняе пачуццё гонару і памяці аб нашых земляках, якія праявілі самую высокую доблесць у Афганістане, а таксама пачуццё смутку па тых, хто не вярнуўся з вайны і паў смерцю храбрых, яшчэ раз пацвердзіўшы слаўнае імя сыноў Беларусі, — заўважыў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ**, які зачытаў зварот Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі да воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў вайны ў Афганістане.

Як адзначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**, воін-інтэрнацыяналіст, які прайшоў гарніла афганскай вайны, — гэта чалавек, які з'яўляецца адным са стрыжняў нашай дзяржавы, патрыёт сваёй краіны, чалавек з выразна акрэсленай жыццёвай пазіцыяй. «Ператвараючы сваю пазіцыю ў жыццё, ён уносіць свой важкі ўклад у справу ўмацавання абараназдольнасці нашай краіны», — лічыць кіраўнік ваеннага ведамства.

— Абаронца Айчыны ў Беларусі заўжды карыстаўся асаблівай павагай, а людзі, якія абаранялі дзяржаву са зброяй у руках, тым больш, — перакананы **старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валерый ГАЙДУКЕВІЧ**. — У Афганістане мы ўпершыню сутыкнуліся з сусветным тэрарызмам і годна выканалі ўскладзеную на нас задачу.

У вайне, якая цягнулася амаль дзесяць гадоў, удзельнічала больш як 30 тысяч грамадзян Беларусі. 771 воін-інтэрнацыяналіст загінуў у Афганістане. Больш як 700 удзельнікаў баявых дзеянняў, вярнуўшыся на Радзіму, заўчасна пайшлі з жыцця — нагадалі аб сабе незагойныя раны і хваробы. 870 беларусаў сталі інвалідамі, 12 сыноў Айчыны зніклі без вестак...

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

НАДЗЕЙНЫ ЗАПАС

Кіруючы склад дзяржаўных органаў, абласных выканаўчых камітэтаў, у тым ліку Мінгарвыканкама, а таксама ваенныя камісары абласцей і сталіцы гэтымі днямі павышаюць узровень індывідуальнай падрыхтоўкі. Збор па пытаннях ваеннай бяспекі і абароны дзяржавы стартаваў з тэарэтычных заняткаў, а завяршыўся ў палявых умовах.

Напярэдадні з запасу прызвалі каля 400 чалавек, адбыліся чатыры зборы па падрыхтоўцы спецыялістаў, неабходных для выканання баявых задач сіламі і сродкамі тэрытарыяльнай абароны. Акрамя таго, пасля навучальных цыклаў з Ваеннай акадэміі выйшлі 57 падрыхтаваных спецыялістаў.

— Дзякуючы гэтым мерапрыемствам на цяперашнім зборы мы выходзім на новы ўзровень падрыхтоўкі тэрытарыяльнай абароны, — адзначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**. — У комплексе разглядаем самыя важныя аб'ёмныя пытанні — правядзенне камандна-штабнога вучэння з раёнам тэрытарыяльнай абароны.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

(Пачатак тэмы на 1-й стар.)

❍ У ТЭМУ

Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:

— У Беларусі тэрытарыяльная абарона рэальна дзейнічае ў кожнай вобласці, у кожным раёне, чаму спрыяе ў тым ліку нарматыўная прававая база, у чым удзельнікі збору пераканаліся гэтымі днямі на прыкладзе Мінскай вобласці, дзе былі паказаны і адпрацаваны ўсе неабходныя дзеянні па абароне жыццёва важных аб'ектаў для насельніцтва. У Брэсцкай вобласці вызначаны канкрэтныя задачы па развіцці тэрытарыяльнай абароны. Карысны вопыт быў атрыманы і падчас гэтага збору.

■ Прафесійны арыенцір

КІМ БЫЦЬ?

Знайсці адказ на гэта складанае пытанне патэнцыйным абітурыентам дапаможа 15-я міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Адукацыя і кар'ера», якая пройдзе ў сталічным Палацы спорту (праспект Пераможцаў, 4) з 16 па 18 лютага. Паралельна з ёй пад адным дахам будзе праходзіць і выстаўка «Адукацыйнае асяроддзе і вучэбныя тэхналогіі». Наведаць за пару гадзін мноства ВНУ, каледжаў, ліцэяў і гімназій, азнаёміцца з ІТ-тэхналогіямі навучання і навейшым вучэбным абсталяваннем — калі яшчэ такое магчыма?

Выставачны праект аб'яднае каля 120 экспанентаў з 11 краін свету. Гэта вядучыя ВНУ, каледжы, ліцэі, універсітэты Беларусі, Расіі, Літвы, Украіны, Латвіі і Польшчы, а таксама адукацыйныя ўстановы Кіпра, Чэхіі, Германіі, Ізраіля. Упершыню ўдзел у выстаўцы возьме адна з найбольш прэстыжных расійскіх ВНУ — Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін.

Наведаць за пару гадзін мноства ВНУ, каледжаў, ліцэяў і гімназій, азнаёміцца з ІТ-тэхналогіямі навучання і навейшым вучэбным абсталяваннем — калі яшчэ такое магчыма?

Да выстаўкі далучыліся таксама інстытуты паслядыпломнай і дадатковай адукацыі, турыстычныя фірмы, якія працуюць у сферы адукацыйнага турызму, моўныя курсы, а таксама кампаніі, якія выпрацоўваюць і пастаўляюць абсталяванне для навучальных устаноў.

На працягу трох дзён на выставачных пляцоўках будуць аказваць прафарыентацыйныя кансультацыі, расказваць пра новыя адукацыйныя тэхналогіі, якія могуць павысіць якасць навучання і яго даступнасць, праводзіць майстар-класы для педагогаў. Для бацькоў карысным будзе наведванне стэнда кансультацыйнага цэнтра камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама «Прастора магчымасцяў».

Асаблівасці цікавых прафесій і найноўшых тэхналогій будуць прадэманстраваны падчас цэлай серыі прэзентацый прафесійных каледжаў і ліцэяў, якія адбудуцца на інтэрактыўнай пляцоўцы «Клічу ў сваю прафесію». Наглядныя і змястоўныя экспазіцыі прадставяць Мінскі дзяржаўны медыцынскі каледж, Мінскі механіка-тэхналагічны прафесійна-тэхнічны каледж, Мінскі каледж сферы абслугоўвання, Мінскі дзяржаўны політэхнічны каледж — філіял БНТУ і іншыя.

Таксама ў рамках выстаўкі «Адукацыя і кар'ера» пройдзе IV Адкрытая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Дарожная карта інфарматызацыі: ад мэты да выніку».

Час работы выстаўкі: 16 і 17 лютага з 10 да 18 гадзін, 18 лютага — да 15 гадзін.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Дэкрэт №3

НЕ ПРАЦАВАЛІ З АБ'ЕКТЫЎНЫХ ПРЫЧЫН

У Віцебскай вобласці, згодна з рашэннем органаў мясцовай улады, прыблізна 140 чалавек вызваленыя ад выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў. Гэта было зроблена ў сувязі з цяжкай жыццёвай сітуацыяй.

У абласным цэнтры з гэтай жа прычыны задаволілі просьбы прыблізна 40% гараджан, якія звярнуліся ў органы ўлады. Як паведамілі ў гарвыканкаме, было больш за 300 зваротаў, з якіх прыкладна трэць разгледзелі. Адпаведная камісія індывідуальна падыходзіць да кожнай сітуацыі. Калі з аб'ектыўных прычын чалавек не мог зарабляць, яму ідуць насустрач. Напрыклад, калі грамадзянін хварэў або даглядаў хворае дзіця, састарэлых бацькоў. Падтрымліваюць і мам-адзіночак, тых, хто пасля воінскай службы не змог уладкавацца на працу, як і пасля вучобы.

Усяго, паводле інфармацыі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Віцебскай вобласці, каля 61,4 тысяч чалавек атрымалі паведамленні з інфармацыяй пра неабходнасць удзелу ў фінансаванні дзяржаўных расходаў. Прыкладна кожны пяты змог даказаць, што не абавязаны выплачваць збор. Гэта, як правіла, тыя, хто знаходзіўся за мяжой, працаваў па працоўных дагаворах, гадуе дзяцей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

АД ЗБОРУ ВЫЗВАЛЕНА 500 ЧАЛАВЕК

Столькі жыхароў Гомельшчыны ўжо змаглі даказаць, што яны не ўтрыманцы.

Каля 500 чалавек на Гомельшчыне вызвалены ад выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў за 2015 год. Гэта лічба дакладная на 15 лютага, і яна пастаянна змяняецца ў бок павелічэння, адзначыў намеснік начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Гомельскай вобласці Дзмітрый ДАЙНЭКА.

Акрамя таго, у Гомельскай вобласці ад выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў у 2015 годзе вызвалены больш за 12 тысяч чалавек, якія пацвердзілі сваю адсутнасць на гэты перыяд у Беларусі. Яшчэ некалькі тысяч аналагічных заяў цяпер разглядаюцца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

КАЛІ НЯМА МАГЧЫМАСЦІ ЗАПЛАЦІЦЬ

У Гродзенскай вобласці разгледжана больш за 300 зваротаў грамадзян аб вызваленні ад уплаты падаткаў у сувязі з цяжкай жыццёвай сітуацыяй.

Заявы пачалі паступаць у снежні гэтага года пасля таго, як у Дэкрэт №3 былі ўнесены змяненні. Па аператыўных даных Гродзенскага абласнога камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, у рэгіёне будзе разгледжана каля 750 зваротаў. Каля паловы заявіцеляў ужо атрымалі вердыкт. Задаволены просьбы 110 жыхароў вобласці. Кожны канкрэтны выпадак вывучае спецыяльная камісія, створаная пры гаррайвыканкамах. Канчатковае рашэнне прымаецца сесіяй гарадскога ці раённага Савета дэпутатаў.

Напрыклад, у Мастоўскім раёне разгледжана 14 заяў з 27. Як паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мастоўскага райвыканкама Марыя СЕМЯНЮК**, большасці тых, хто звярнуўся, просьбу задаволілі. Сярод іх некалькі жанчын, якія нарадзілі дзяцей у канцы года, але да гэтага не працавалі. Станоўчы вынік прыняты па заяве мужчыны, які ў мінулым годзе працаваў, але на некалькі дзён менш, чым патрэбна для вызвалення ад падаткаў. Дэпутаты не адмовілі сям'і, дзе пражывае дзяўчына-інвалід, бацькі якой вырашылі сацыялізаваць дачку і знялі інваліднасць, але знайсці працу дзяўчыне не ўдалося. Таксама пайшлі насустрач жанчыне, якая вымушана была звольніцца з працы, каб даглядаць састарэлую маці. «Добра, што такія папраўкі да дэкрэта з'явіліся, — лічыць Марыя Семянюк, — бо становішча некаторых жыхароў не дае магчымасці заплаціць падатак». Разам з тым, зазначае спецыяліст, ёсць выпадкі, калі ў вызваленні ад збору адмоўлена. У Мастоўскім раёне пакуль такіх тры. Па Гродзенскай вобласці, згодна з аператыўнымі данымі, адмоўлена ў вызваленні ад збору каля 200 чалавекам. Разгляд зваротаў працягваецца. Канчаткова гэта работа будзе завершана 20 лютага. Збор па фінансаванні дзяржаўных расходаў заплаціл 4,2 тысячы жыхароў Гродзенскай вобласці.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

18 ТЫСЯЧ МІНЧАН ЗВЯРНУЛІСЯ ПА ТЛУМАЧЭННІ

Падатковая інспекцыя ўносіць яснасць у пытанне аб тым, хто такія «ўтрыманцы»

Па даных на 13 лютага, збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў выплацілі 15 тысяч мінчан. Усяго паведамленні атрымалі каля 106 тысяч жыхароў сталіцы. Агульная сума атрыманых ад мінчан сродкаў пакуль склала 4,2 мільёны рублёў.

Як растлумачыла на прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме **намеснік начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Мінску Галіна ГУРЫНОВІЧ**, кожны выпадак разглядаецца асобна, нават калі сітуацыі здаюцца падобнымі адна на адну, па сутнасці яны могуць быць абсалютна рознымі.

Усяго правам датэрміновай выплаты збору скарысталіся каля 1,3 тысячы мінчан. З 1 жніўня бягучага падатковага перыяду па 31 мая наступнага года грамадзяне могуць самастойна паведаміць у падатковую інспекцыю пра няўдзел у фінансаванні дзяржаўных расходаў. Калі да 1 ліпеня збор выплачаны, то ён памяншаецца на 10%.

З пытаннем аб вызваленні ад выплаты збору ў сувязі з цяжкім жыццёвым становішчам у службу «Адно акно» гарадскога выканаўчага камітэта і раённых адміністрацый звярнулася каля тысячы чалавек. У выніку Мінгарвыканкам накіраваў у падатковыя інспекцыі сталіцы 99 рашэнняў, а льготу атрымалі 17 чалавек.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

ЦІ ПАТРЭБНЫЯ ЗАВОДЫ У ЖЫЛЫХ РАЁНАХ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аказваецца, у Таццяны трое дзяцей. На размовы ў яе ўсяго 10 хвілін, таму што трэба ісці забіраць сярэднюю дачку са школы.

— Я сама не з Мінска, больш за 15 гадоў «бадзялася» па здымных кватэрах, жыла ў розных кутках горада. І, вядома, калі мы задумаліся аб уласным жыллі, яшчэ да з'яўлення Мікіткі (малодшага сына), мне хацелася, каб гэта быў новы, чысты і прыгожы раён. Таму мы і спынілі выбар на гэтым месцы, а вялікі паўпарк-паўлес толькі дадаў раёну ачкоў, — расказвае Таццяна. — Скажу шчыра, на блізкасць да прамзоны ўвагі мы не звярнулі. Трубы не дымяць — і тое добра. Калі паднялася гэта хваля абурэння, вядома, я была ў курсе: дзіцячыя пляцоўкі — гэта ж галоўныя «форумы» для абмеркавання такіх пытанняў. Я разумею, чаму супраць выступаюць многія мамы: калі гаворка заходзіць пра ўмовы жыцця іх дзяцей, яны змагаюцца за найлепшыя, і ніякія разумныя довады пераканаць іх не могуць. У галаве адразу з'яўляецца падсвядомая думка, што заводы — гэта забруджванне навакольнага асяроддзя, а забруджванне навакольнага асяроддзя — хваробы, якія, у першую чаргу, закранаюць дзяцей. Калі гэта вытворчасць будзе сапраўды бяспечнай, хацелася б пачуць простае тлумачэнне — чаму. Было б нядрэнна, каб хаця часова ў лесапарку або на бліжэйшых прыпынках з'явіліся інфармацыйныя плакаты. А так быццам і верыш, што ўсё будзе добра, але ўсё-такі не да канца.

Затрымаўшыся даўжэй, чым планавала, Таццяна ў спешцы збіраецца і практычна ўцякае. А мы тым часам шукаем новую «ахвяру». На набліжэнне гэтай «пары» цяжка не звярнуць увагу: брэх маленькага, але вельмі гучнага сабачкі з арыгінальнай мянушкай Шарык разносіцца на дзясяткі метраў наперад. Яго гаспадыня Таццяна Васілеўна жыве ў гэтым раёне ўжо практычна 30 гадоў. У двухпакаёвай кватэры яна месціцца з мужам і сям'ёй сына, у якога хутка з'явіцца другое дзіця.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Мой сын працуе на Трактарным заводзе. Некаторы час яны з жонкай спрабавалі здымаць непадалёк ад яго кватэру, але потым усё ж такі вярнуліся да нас, таму што і матэрыяльна было няпроста, і з дзіцем дапамога патрэбна. І атрымліваецца, што на тое, каб дабрацца на працу, у яго сыходзіць шмат часу, які можна было б праводзіць з сям'ёй. Таму я вельмі здзівілася, калі людзі пачалі выступаць супраць будаўніцтва завода ў нас непадалёк. Гэта ж так зручна, калі ўсё побач! І да таго ж, колькі з'явіцца новых працоўных месцаў... А тое, што праблемы з працаўладкаваннем зараз ёсць, усе ведаюць. Дык няўжо, калі выбіраць паміж «прыгожым знешнім выглядам» раёна і працаўладкаваннем тысяч людзей, могуць узнікнуць пытанні? — узрушана падвяла вынік Таццяна Васілеўна.

Больш у той дзень такія гаваркія суразмоўцы нам не трапляліся: астатнія альбо коратка адказвалі «нічога пра гэта не ведаю», альбо выдавалі быццам бы завучаную фразу «мы супраць», хоць ніякіх аргументаў, акрамя як «завод не можа быць бяспечным», не прыводзілі.

Справа не ў заводах, а ў аўтамабілях

Пачуўшы «голас народа», мы звярнуліся з пытаннем ва ўпраўленне архітэктуры і будаўніцтва адміністрацыі Фрунзенскага раёна. Аказалася, што спрэчную тэрыторыю вызначылі як вытворчую зону, яшчэ калі мікрараёна Сухарава не было і ў паміне. І ў далейшым генеральныя планы горада розных гадоў толькі ўмацоўвалі гэты статус. На галоўнае пытанне: ці будзе вытворчасць бяспечнай, ёсць дакладны адказ — так, інакш яна не мела б магчымасці тут з'явіцца.

У размяшчэнні вытворчасцяў у жылых раёнах ёсць нешта ад ідэі стварыць горад у горадзе. Гандлёва-забаўляльныя цэнтры са сваімі кінатэатрамі, кафэ, крамамі, гульнявымі заламі паступова з'яўляюцца ў кожным мікрараёне горада. Дык чаму не правесці аналогію і са стварэннем працоўных месцаў: пачаць таксама больш актыўна размяшчаць і заводы, і офісы не толькі ў цэнтры? Гэта дазволіць чалавеку пры неабходнасці практычна ўсе свае задачы вырашыць паблізу ад дома, тым самым аптымізаваўшы свой час, да таго ж, такая перспектыва дапаможа знізіць нагрузку на перапоўнены цэнтр.

І ўсё ж такі вернемся да нашага прыкладу. Кожны павінен займацца сваёй справай: будаўнікі — будаваць, а вывучаць экалогію — профільныя ўстановы. Таму па тлумачэнні наконт галоўнага пытання — бяспекі — мы звярнуліся ў Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя. Два галоўныя параметры, ад якіх залежыць ступень уздзеяння прадпрыемства на экалогію раёна, — ружа вятроў і вышыня труб завода. Дарэчы, Сухарава, нягледзячы на блізкасць ЦЭЦ, з'яўляецца спрыяльным з пункту гледжання чысціні навакольнага асяроддзя раёнам. Таму цалкам верагодна, што новыя прадпрыемствы, пры выкананні ўсіх тэхнічных параметраў, ніякай шкоды ні раёну, ні тым больш яго жыхарам не нанясуць. Наогул галоўная праблема мегаполісаў — гэта далёка не заводы, а здавалася б, невялікія, але распаўсюджаныя ў велізарнай колькасці аўтамабілі. Менавіта на выхлапныя газы прыпадае больш за 80% забруджванняў паветра ў гарадах.

Выносіць ці не выносіць?

Такім чынам, атрымліваецца, што вытворчасць бяспечная, і ўсе маглі б жыць спакойна і шчасліва, але... гэта датычыцца толькі гэтага канкрэтнага выпадку. У свеце не проста так існуе тэндэнцыя вынасу вытворчасцяў за мяжу горада, а як даволі злосна жартуюць у вядомым анекдоце: многія краіны пайшлі яшчэ далей — яны вынеслі вытворчасці за межы сваёй тэрыторыі.

У большасці буйных гарадоў па ўсім свеце ўжо даўно прыйшлі да высновы, што вытворчасцям дакладна не месца ў цэнтры горада. Мінск у гэтым пытанні прытрымліваецца агульных арыенціраў: ёсць не адзінкавыя прыклады, калі будынкі былых заводаў альбо зносяцца, альбо перапрафілююцца, што цяпер вельмі папулярна ў сталіцы. Так, некалькі карпусоў завода «Гарызонт» ператварыліся ў сапраўдную зону творчасці: тут і танцавальныя і мастацкія студыі, і інтэлектуальныя квэсты, і нават вольныя прасторы, дзе праходзяць розныя мерапрыемствы ад выстаў да модных маркетаў і вечарынак. У Еўропе нярэдка былыя заводы аддаюць пад музеі, гандлёвыя залы і нават кватэры. Хто ведае, магчыма, і ў нас хутка з'явіцца такое жыллё з гісторыяй...

Аднак гэта толькі адзін бок пытання. А што рабіць з «бруднымі» вытворчасцямі, размешчанымі ў прамысловых раёнах? Або ў такіх раёнах, пра якія не зусім зразумела: адносіць іх да цэнтра ці ўжо не? У новым генеральным плане горада, які жыхары сталіцы ўбачылі летась, пазначана патэнцыйная магчымасць перадыслакацыі некаторых вытворчасцяў. Прычым, у адрозненне ад больш ранняй дакументацыі, канкрэтны спіс не называецца. Гаворка ідзе аб перамяшчэнні не толькі за межы горада, але і на тэрыторыю гарадоў-спадарожнікаў.

Тым не менш верыцца ў гэта пакуль з цяжкасцю. Працэс «пераезду» вельмі затратны, прычым гэта датычыцца не толькі разавага ўкладання, але і павелічэння агульных выдаткаў. Напрыклад, давядзецца мяняць наладжаныя каналы пастаўкі сыравіны або прадукцыі, акрамя таго, паўстане пытанне з дастаўкай супрацоўнікаў да рабочага месца. Магчыма, павелічэнне расходаў пацягне за сабой зніжэнне заработнай платы пры менш зручных умовах. Так што пакуль «пазбаўленне» горада ад вялікай колькасці прадпрыемстваў нагадвае ўтопію.

Раз мы яшчэ толькі на шляху да постындустрыяльнага грамадства, неабходна падладжвацца пад ужо існуючыя ўмовы. Уявіць буйны горад без вытворчасцяў усё ж такі немагчыма. І, напэўна, ісціна, як заўсёды, дзесьці пасярэдзіне: калі будзе магчымасць — выносіць, але паступова і не ўсё, калі будзе магчымасць — будаваць, але ў разумных колькасцях і без урону для экалагічнай сітуацыі.

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

16 ЛЮТАГА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№ 4 (15811)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Гурт Belaroots:

«Для нас рэп — як трыбуна»

Злева Zeman, справа — Angst.

Кожны з іх ужо мае свой праект, сваіх прыхільнікаў і ўласныя творчыя набыткі. Але, аб'яднаўшыся, выканаўцы Zeman, Angst і Kontra здолелі запісаць насамрэч знакавы для беларускага рэпа альбом. Рэліз «Аднакарэнныя» гурта Belaroots стаўся адной з найярчэйшых прэм'ер пачатку года і нагадаў: наш рэп жывы, моцны, гучны і здольны натхняць. Альбом вяртае ў мінулае, распавядае пра сучаснасць, у ім гучаць (у адэкватнай колькасці) патрыятычныя матывы. Нашы суразмоўцы Zeman і Angst расказалі пра мэты аб'яднання ў адным гурце, рэперскую моду і важнасць супольнай працы ў камандзе.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Асабісты прыклад

ШЛЯХ У АКАДЭМІКІ

Моладзі шчыра расказалі, ці можна разбагацець, займаючыся навукай

«Мая любоў — цытахром Р450, вывучэнню якога прысвечана большая частка жыцця. А ўвогуле, пасля 45 гадоў працы ў сферы біяарганічнай хіміі, я магу з упэўненасцю сцвярджаць, што, з хімічнага пункту погляду, жыццё чалавека — вельмі простая рэч. Гэта сукупнасць мноства хімічных рэакцый, якія адначасова працякаюць у часе і прасторы», — такую нечаканую заяву пачулі ад члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук, доктара хімічных навук, прафесара Сяргея УСАНАВА ўдзельнікі «Сустрэчы пакаленняў вучоных», якая прайшла ў галоўным храме навукі. Арганізатарамі маштабнага мерапрыемства выступілі НАН Беларусі і Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь». На сустрэчу з вядучымі даследчыкамі, акадэмікамі, членамі-карэспандэнтамі акадэміі былі запрошаны больш за чатыры сотні студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, якія праяўляюць цікаўнасць да навуковай дзейнасці. Падчас своеасаблівай «прома-акцыі» акадэмічнай навукі масцітыя вучоныя расказвалі моладзі пра свой шлях у навуку, пра тое, над чым яны сёння шчыруюць у даследчых лабараторыях, давалі парады, як дабіцца поспеху ў навуковай сферы і знайсці сваё «месца пад сонцам». Ва ўсіх ахвотных была таксама магчымасць наведаць вядучыя навукова-практычныя цэнтры і акадэмічныя інстытуты.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Моладзь вельмі ўважліва слухала акадэмікаў...

Як от=куцюр!

«Першую сукенку пашыла ў 11»

Мінская школьніца заваёўвае подыум

У восьмым класе дзяўчаты на ўроках працоўнага навучання звычайна шыюць пасцельную бялізну. 14-гадовая Аляксандра КАЗЛОЎСКАЯ тым часам стварае моднае адзенне. У яе скарбонцы — трэцяе месца на «Млыне моды 2016», перамога ў конкурсе Вячаслава Зайцава «Губернскі стыль», узнагарода «Дэбют года» на Estet Fashion Week у Маскве. А ў студзені калекцыя Аляксандры патрапіла на подыум у Харбін (Кітай). Пра інтуіцыю на тэндэнцыі і дызайнераў, якія яе натхняюць, юны мадэльер расказала карэспандэнту «Чырвонкі. Чырвонай змены».

СПАДНІЦА, ЯК У ШАНЭЛЬ

Сашына майстэрня займае адзін з пакояў у кватэры. Мама Алена, калі заўважыла талент дачкі, пагадзілася аддаць ёй для творчасці прасторную залу. На паліцах — рулоны тканіны, па тэлевізары — трансляцыя модных паказаў, на вешалках — уборы Сашынага дызайну.

— З шасці гадоў я шыла цацкі, простае адзенне для лялек, — расказвае вучаніца 20-й сярэдняй школы Мінска. — А ў 11 гадоў зрабіла першую сукенку для сябе. Убачыла тканіну, якая мне спадабалася, без інтэрнэту прыдумала фасон — складаны, з каўнерыкам, манжэтамі. Ніякіх выкраек: усё рабіла на вока, дзесьці падразала сукенку проста на сабе. Атрымалася не па правілах, але вельмі цікава.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

16 02 2017 г.

Хачу на журфак!

КОД ДОСТУПУ

«Я Расолька Сяргей Уладзіміравіч, рэдактар аддзела газеты «Звязда», адзін з кураторaў маладзёжнага дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена». Дасланы матэрыял па тэматыцы якраз для яго. Дадатак выходзіць двойчы на месяц...» Вы ведаеце, колькі разоў за апошнія пяць гадоў менавіта так я пачынаў электронныя лісты да тых маладых людзей, якія марылі стаць журналістамі? Іх атрымлівалі і многія цяперашнія выпускнікі журфака, на іх разлічваюць і сённяшнія абітурыенты. Але, пагадзіцеся, напісаць ці пазваніць літаральна кожнаму асабіста немагчыма фізічна. Таму мы вырашылі ўвесці ў дадатку новую рубрыку, у якой пастараемся даваць кароткія рэкамендацыі тым, хто сёлета вырашыў спраўдзіць сваю мару — стаць журналістам. Пра тое, што наперадзе гарачая пара паступлення, сведчыць традыцыйны штогадовы ўсплёск зваротаў у рэдакцыю цяперашніх выпускнікоў школ.

«Піша вам будучы журналіст...» Смелая заява, якую тым не менш лепш адразу падмацаваць справай. Напрыклад, пералікам тэм, якія аўтар хацеў бы прапанаваць ад сябе. Або, што яшчэ лепш, ужо напісаным матэрыялам, каб можна было скласці першаснае ўяўленне пра творцу і даць яму нейкія парады. Адкуль нам вядома, чым захапляецца і ў якіх сферах мае досвед наш адрасант? За рэдкім жа выключэннем далей чытаем нешта накшталт таго, што аўтар гатовы выконваць розныя заданні рэдакцыі і пісаць на любыя тэмы... Зноў жа смелае для школьніка выказванне, але нічым не падмацаванае.

Праблема тут бачыцца вось у чым. Маладыя чалавек у большасці выпадкаў у апошні момант вырашыў, што будзе паступаць менавіта на журфак. Адсюль, магчыма, і не поўнае валоданне сітуацыяй і гэтая няўпэўненасць у сабе, якая хаваецца за паказной смеласцю. Справа ў тым, што звяртацца ў газету трэба было не зараз, а год, два ці нават тры таму. А перад гэтым запісацца ў гурток журналістыкі пры сваёй школе ці доме творчасці, каб атрымаць першасныя веды пра жанры, пра саму прафесію. Усё ж «проба пяра» для газеты — гэта не зусім тое, што школьны рэферат ці сачыненне. Залішніх патрабаванняў да аўтара, канешне, прад'яўляць ніхто не будзе, але «планка» для газетных публікацый усё ж значна вышэйшая. Але паспрабуем дапамагчы і тым, хто спяшаецца ўскочыць у «апошні вагон».

Найперш пра самае дзіўнае (ці недарэчнае), з чым даводзіцца сутыкацца пры стасунках з маладымі аўтарамі. Многія з іх незнаёмыя ці амаль незнаёмыя... з газетай, у якую пішуць. Прынамсі пра гэта сведчаць звароты юных аўтараў на рускай мове. Не раз былі выпадкі, калі абітурыенты звярталіся ў рэдакцыю з просьбай падказаць, калі надрукавалі іх публікацыю, ці ўвогуле — папрасіць той самы нумар газеты. І ў іх ліку былі тыя, хто збіраўся паступаць на спецыяльнасць «Друкаваныя СМІ»! Вы можаце ўявіць сабе сітуацыю, калі чалавек хоча стаць кухарам, але пры гэтым прынцыпова не заглядвае ў рэцэптурныя даведнікі? А імкнуцца ў будучым працаваць у газеце, не чытаючы яе зараз, выходзіць, можна?..

У гэтым выпадку звяртаюся не столькі да саміх абітурыентаў, колькі да іх бацькоў, настаўнікаў, кіраўнікоў гурткоў. Будучыя студэнты, на наш погляд, проста абавязаны рэгулярна трымаць у руках друкаваны варыянт газеты! Найлепшае выйсце для іх — падпісацца, а не праглядаць зрэдку нумар у школьнай бібліятэцы ці на занятках у гуртку. Як вы думаеце, якія пытанні найбольш імаверна прагучаць ад членаў прыёмнай камісіі, калі яны даведаюцца, што патэнцыяльны студэнт друкаваўся ў маладзёжным дадатку «Звязды» «Чырвонка. Чырвоная змена»? Канешне, пра тое, якіх аўтараў ён памятае, на якія тэмы яны пісалі, які матэрыял канкрэтна яму найбольш запомніўся. Як думаеце, прэтэндэнт на студэнцкі білет зможа бліскуча на іх адказаць? Зноў жа, можна будзе без праблем скласці ўласнае партфоліа творчых работ для паступлення, а не ехаць, як было неаднаразова, з іншага горада ў сталіцу, каб завізіраваць у рэдакцыі ксеракопію газетнай старонкі. Занатавалі? Працягнем наступны раз. Калі ёсць пытанні, задавайце.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ШЛЯХ У АКАДЭМІКІ

Вучоны — «штучны тавар»

Старшыня прэзідыума НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ прызнаўся, што ў студэнцкія гады пра навуковую кар'еру нават не марыў. І толькі прыйшоўшы на вытворчасць зразумеў, што трэба працягваць распачатыя падчас студэнцтва навуковыя пошукі. Таму паступіў спачатку ў завочную аспірантуру, а потым працягваў вучобу ўжо вочна.

— У тыя часы спецыяльна ў навуку нікога не запрашалі, але паток з ахвотных рэалізоўваць сябе ў гэтай сферы не спыняўся, — усміхаецца Уладзімір Гусакоў. — Калі б мне сёння прыйшлося пераконваць маладога чалавека зрабіць свой выбар на карысць навукі, то я, напэўна, сказаў бы яму, што толькі навука стварае неабмежаваныя магчымасці для раскрыцця здольнасцяў і таленту. Сёння трэцяя частка навукоўцаў у акадэміі — гэта моладзь: канкурэнтная, таленавітая, перспектыўная, на якую мы робім стаўку. Штогод у Нацыянальную акадэмію навук уліваецца каля 350 маладых спецыялістаў. Дэфіцыту кадраў у нас няма, задача амаладжэння выконваецца. Да таго ж я ўпэўнены, што масавасць у навуцы зусім непатрэбная. Вучоны — гэта «штучны тавар», і толькі адзінкі могуць быць генератарамі ідэй, таму ў навуку павінны прыходзіць яркія асобы...

Уладзімір Гусакоў расказаў гасцям, што ў хуткім часе свет зменяць 10 прарыўных тэхналогій — воблачныя тэхналогіі, уключаючы мабільны інтэрнэт і інтэрнэт «рэчаў», аўтаматызацыя інтэлектуальнай працы, электронная робататэхніка, самакіравальныя тэхнічныя комплексы (аўтамабілі), даследаванні ў галіне геномікі (чалавека, жывёл і раслін), найноўшыя магутныя накапляльнікі энергіі, трохмерны друк і кампазіцыйныя нанаматэрыялы. Па ўсіх гэтых кірунках паглыблена працуе і беларуская навука, і нашы вынікі прызнаюцца вядучымі сусветнымі цэнтрамі.

Героі свайго часу

Старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр РАДЗЬКОЎ падкрэсліў, што многія вучоныя зрабілі свае адкрыцці ў зусім «юныя гады». Як, напрыклад, нарвежскі матэматык Нільс Хенрык Абель, які памёр ва ўзросце 26 гадоў. Усе яго адкрыцці намнога апераджалі ўзровень навукі першай паловы XIX стагоддзя. Працы вучонага, дасланыя ў Парыжскую акадэмію навук і перададзеныя знакамітаму французскаму матэматыку Кашы, былі згублены. На ліст выдатнаму нямецкаму матэматыку Гаўсу адказу не было. У выніку Нільса Абеля, які здзейсніў пераварот у навуцы, звялі ў магілу цяжкая хвароба і жабрацкае існаванне. А ў XXI стагоддзі нарвежскім урадам была заснаваная Абелеўская прэмія, якую паспелі ахрысціць «матэматычнай Нобелеўскай прэміяй» — сёння гэта адна з самых прэстыжных узнагарод у матэматыцы. Яе пераможцаў вызначае Міжнародны матэматычны саюз і Еўрапейскае матэматычнае таварыства.

Яшчэ адзін не менш красамоўны прыклад — жыццё французскага матэматыка Эварыста Галуа, забітага на дуэлі ў 20-гадовым узросце. Ён загінуў раней, чым паспеў стаць вядомым у навуковых колах. Усяго за чатыры гады захаплення матэматыкай Галуа зрабіў адкрыцці, якія ставяць яго на адзін узровень з найбуйнейшымі матэматыкамі XIX стагоддзя. Фактычна заклаў асновы сучаснай алгебры, але прызнанне прыйшло да Галуа толькі праз 40 гадоў пасля яго смерці...

Праўда, і вялікія таксама памыляюцца. Пра гэта моладзі расказаў аўтар больш чым 420 навуковых работ **акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, доктар геаграфічных навук, прафесар Уладзімір ЛОГІНАЎ:**

— Кароль віктарыянскай фізікі лорд Кельвін настойваў на тым, што сонечная актыўнасць не мае ніякага дачынення ні да палярнага ззяння, ні да магнітных бур на Зямлі. А знакаміты савецкі акадэмік Андрэй Монін (геафізік, акеанолаг і матэматык) яшчэ ў 70—80-я гады XX стагоддзя быў упэўнены ў тым, што «сувязь паміж сонечнымі цыкламі і надвор'ем на Зямлі — толькі ўдалыя вопыты па самаўнушэнні». Але сёння гэта ўжо ні ў кога не выклікае сумненняў.

Прагнозы кліматолага

Міні-лекцыю вядомага кліматолага пра прычыны змянення клімату на Зямлі і тое, як надвор'е паўплывала на ход гісторыі, студэнты і аспіранты праслухалі з захапленнем.

— Не варта думаць, што мы сёння жывём у нейкім унікальным перыядзе і пацяпленне, якое назіраем, першае ў гісторыі, — адразу паспрабаваў разбурыць распаўсюджаны стэрэатып Уладзімір Логінаў. — Нават у Пушкіна ў рамане «Яўген Анегін» ёсць такія радкі: «В тот год осенняя погода / Стояла долго на дворе / Зимы ждала, ждала природа / Снег выпал только в январе». Гэта мастацкі доказ таго, што і раней былі такія ж цёплыя зімы, як цяпер.

Акадэмік сцвярджае, што 2015—2016 гады не сталі б самымі гарачымі ў найноўшай гісторыі, калі б не магутнае Эль-Ніньё — пацяпленне на некалькі градусаў у Ціхім акіяне. А паколькі цеплаёмістасць акіяна ў тысячу разоў большая за цеплаёмістасць паветра, гэтыя некалькі градусаў вады моцна награваюць атмасферу, прыводзячы да ўсплеску тэмператур.

— Мой прагноз на тры найбліжэйшыя гады? Глабальная тэмпература панізіцца, таму што Эль-Ніньё — прыродная з'ява, якая паўтараецца праз 3—5 гадоў. Тады наступіць эпоха Ла-Нінья — тэмпература ў акіяне пачне знікацца, і глабальная тэмпература пойдзе ўслед за ёй. Калі я маю рацыю, то тэмпература да 2019—2020 года (усё залежыць ад магутнасці і працягласці Эль-Ніньё) зменшыцца на 0,1—0,2 градуса ў параўнанні з 2014—2016 гадамі. Тэмпературная анамалія ў Беларусі тры апошнія гады была самая высокая. У наступныя тры гады тэмпература ў нашай краіне будзе ў сярэднім на адзін градус ніжэйшая, чым у 2014—2016 гадах. Ці маю я рацыю, вы хутка самі зможаце праверыць, — смела прапанаваў Уладзімір Логінаў.

Не месца для зайздрасці

І ўсё ж такі, як быць тым маладым людзям, якія пакуль яшчэ вагаюцца, куды ім ісці: на вытворчасць, у бізнес ці ўсё ж такі ў навуку?

— Гэты шлях вельмі складаны. І грошай вялікіх вы тут не заробіце, — шчыра папярэдзіў маладых людзей **акадэмік, дырэктар Інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі, доктар хімічных навук, прафесар Уладзімір АГАБЕКАЎ:** — Не менш важна мець надзейны тыл. Мая жонка ахвяравала сваёй кар'ерай дзеля таго, каб я займаўся навукай. Толькі ўявіце сабе сітуацыю: вы будзеце гарэць навукай, а ваша абранніца будзе казаць вам штодня: «Ідзі зарабляй грошы». Навука не церпіць мітусні, тут нельга разлічваць на імгненны эфект, як у песні «Мы хотим сегодня, мы хотим сейчас». Гэта вялікая праца, але праца — удзячная. У навуцы ўсё трэба рабіць грунтоўна. На мой погляд, не трэба баяцца змяняць тэматыку і навуковую школу. Навука — гэта вялікая супольнасць, і тут няма месца зайздрасці, вы павінны паважаць сваіх калег, спаборнічаць з імі, але не зайздросціць...

Сучасная навука — гэта камандная гульня. Таму вучыцца рабоце ў камандзе трэба яшчэ ў магістратуры. Яе дзейнасць трэба перабудоўваць. Няхай яшчэ на гэтай ступені вышэйшай школы дасягнулі поспехаў. Але асабіста я для сябе вылучаю перыяды, калі не чытаю ніякую літаратуру, а засяроджваюся толькі на ўласнай рабоце. Пры гэтым ведаю людзей, якія вельмі шмат увагі надаюць літаратурнаму агляду, яны заўсёды ў курсе ўсіх апошніх падзей, але іх справа наперад не рушыцца. Таму я і выступаю за разумны баланс.

«Навука не церпіць мітусні, тут нельга разлічваць на імгненны эфект».

Член-карэспандэнт НАН Беларусі, дырэктар Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі, генеральны дырэктар дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі», доктар біялагічных навук Эмілія КАЛАМІЕЦ канстатуе:

— Шлях у навуку ва ўсіх розны. Здараецца, што ты і не марыў, і не планаваў, а аказаўся ў самым эпіцэнтры. Я закончыла політэхнічны інстытут, і біялогія ў маім рэйтынгу школьных дысцыплін займала апошнія месцы. Але ў выніку мае веды аказаліся запатрабаванымі ў мікрабіялогіі. Менавіта тут я змагла рэалізаваць усё, што я ведала, у мяне з'явілася магчымасць кіраваць магутнай сілай. Тым, хто сёння шукае адказы на свае пытанні, я скажу, што калі ты ў школе бяжыш пасля ўрокаў дамоў, каб рашыць цяжкую задачку, то гэта першы крок у навуку. Калі ты, будучы студэнтам, закрыў канспект і думаеш пра тое, што трэба яшчэ пашукаць дадатковую літаратуру, то гэта другі крок. Галоўнае зразумець, што навукай трэба жыць паўсюдна: і дома, і ў гасцях, і на дачы, і ў водпуску. Проста

...а потым з задавальненнем фатаграфавалася з імі.

Трамплін для росту

— Якія фактары вызначаюць поспехі ў навуцы? Першае — гэта інтарэс. Калі вам нецікава займацца навукай, нецікава штосьці даследаваць, то ніякія замежныя паездкі і іншыя даброты не прывядуць вас да поспеху, — упэўнены **акадэмік, заслужаны энергетык Рэспублікі Беларусь Аляксандр МІХАЛЕВІЧ.** — Другое — гэта няўдачы. Як ні дзіўна, але мой асабісты досвед даказвае, што менавіта яны вельмі моцна спрыяюць прафесійнаму росту і вырашэнню праблем. Калі ў вас усё добра складваецца з самага пачатку, рыхтуйцеся да падвоху. А калі сутыкнуліся з няўдачай, то шукайце яе прычыны: рашэнне можа знаходзіцца зусім не ў тым месцы, дзе вы шукаеце. Разгадка можа хавацца ў тых дробязях, на якія ты не звяртаеш увагу. Дробязяў у навуцы ўвогуле не бывае...

Трэцяе — гэта баланс. Для таго, каб займацца навукай, безумоўна, трэба ведаць сітуацыю ў сваёй навуковай вобласці: над чым працуюць твае калегі, якіх лы ў адным калектыве збіраюць хімікаў, матэматыкаў, праграмістаў, інжынераў-тэхнолагаў... Бо ўсе задачы сёння вырашаюць не адзіночкі, а мультыпрофільныя каманды спецыялістаў.

Трэцяе — гэта баланс. Для таго, каб займацца навукай, безумоўна, трэба ведаць сітуацыю ў сваёй навуковай вобласці: над чым працуюць твае калегі, якіх прасядзець ад званка да званка тут не атрымаецца... У мяне была супрацоўніца, якая з адной лічбы развівала мноства ідэй. Але ёсць і такія маладыя супрацоўнікі, якія атрымаюць патрэбную лічбу, а далей іх ужо нічога не цікавіць..

Старшыня Савета маладых навукоўцаў аддзялення хіміі і навук аб Зямлі, кандыдат хімічных навук Таццяна ПЛІСКО таксама лічыць, што навука — гэта асаблівы лад жыцця. Прычым у сучасных рэаліях вучоны павінен не толькі генерыраваць ідэі, але і ўмець арганізаваць навуковае даследаванне, сфарміраваць навуковую групу, падумаць, каму могуць быць цікавыя вынікі гэтага даследавання. Вось толькі ў нашых універсітэтах гэтаму не вучаць. На сустрэчы Таццяна прэзентавала новы праект «Вучоны пад ключ» — пяцідзённую школу для аспірантаў, магістрантаў і таленавітых маладых навукоўцаў, дзе іх будуць вучыць усяму: ад падрыхтоўкі навуковых публікацый, прэзентацый, праектаў і дысертацый «пад ключ» да знаёмства з вопытам паспяховай прадпрымальніцкай дзейнасці ў навуцы. Але гэта ўжо асобная тэма для размовы...

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Свой выбар

Арыгінал супраць падробкі

ЗА ШТО МОЛАДЗЬ ГАЛАСУЕ РУБЛЁМ...

Стаўленне моладзі да кантрафактнай прадукцыі і нелегальнага гандлю ўпершыню аказалася ў цэнтры ўвагі штогадовага сацыялагічнага даследавання «Маладзёжны брэнд», якое праводзіцца асацыяцыяй абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд» сумесна з Маладзёжнай лабараторыяй сацыялагічных даследаванняў Цэнтральнага камітэта БРСМ.

Выбар гэтай тэмы быў выкліканы некалькімі прычынамі. Па-першае, адным з кірункаў дзейнасці асацыяцыі «БелБрэнд» з'яўляецца стварэнне прафесійнай дыскусійнай пляцоўкі па актуальных праблемах абароны інтэлектуальнай уласнасці і адстойванне інтарэсаў бізнесу, у тым ліку і на міждзяржаўным узроўні. Маладзёжнае прадпрымальніцтва — вельмі важны сегмент бізнесу, аднак узровень ведаў і каштоўнасныя ўстаноўкі маладых людзей у сферы абароны інтэлектуальнай уласнасці да гэтага часу не былі прадметам сацыялагічных даследаванняў.

Яшчэ адна прычына — шматвектарнасць эканамічных і гандлёвых адносін, што павышае рызыку пранікнення ў нашу краіну кантрабанднай і кантрафактнай прадукцыі, а таксама яе транзіту ў еўрапейскія краіны. Акрамя таго, існуе прамая ўзаемасувязь паміж нелегальным гандлем, распаўсюджваннем кантрафактнай прадукцыі і такімі з'явамі, як тэрарызм, карупцыя і рост эканамічных злачынстваў.

Як паказалі вынікі апошняга даследавання, якое завяршылася напрыканцы 2016 года, у цэлым моладзь мае ўяўленне пра тое, што такое кантрафактная прадукцыя, і можа разважаць на гэтую тэму. Аднак траціна апытаных альбо не ведае зусім, альбо маладым людзям праблематычна растлумачыць, што маецца на ўвазе пад тэрмінам «кантрафактная прадукцыя». Большасць рэспандэнтаў (56%) спецыяльна не цікавяцца кантрафактнай прадукцыяй і месцамі яе набыцця. Толькі 13% рэспандэнтаў займаюцца пошукам падобнай інфармацыі. 96% рэспандэнтаў, якія наўмысна шукаюць інфармацыю аб кантрафактнай прадукцыі і месцах яе набыцця, выкарыстоўваюць для гэтага інтэрнэт.

З прапанаваных для ацэнкі груп тавараў рэспандэнты найбольш актыўна падтрымліваюць арыгінальных вытворцаў прадуктаў, лекаў і біялагічна актыўных дабавак. А найбольш індыферэнтнай моладзь аказалася ў адносінах да кантрафактнага адзення і абутку — на карысць арыгінальнага тавару выказаліся толькі на 16% рэспандэнтаў больш.

Не будуць набываць кантрафактную прадукцыю 28% апытаных, «хутчэй за ўсё не будуць» — яшчэ 27%. Такім чынам, большасць рэспандэнтаў (55%) у той ці іншай меры схільныя адмовіцца ад усвядомленага набыцця кантрафактнай прадукцыі.

Цвёрдае «так» набыццю кантрафактнай прадукцыі сказалі 11% апытаных. 22% прызналіся, што «хутчэй за ўсё, яны будуць яе набываць». Не вызначыліся з адказам яшчэ 12%.

Як высветлілася, для моладзі асноўны матыў усвядомленага набыцця кантрафактнай прадукцыі — больш нізкі яе кошт у параўнанні з арыгіналам (85%). Таксама сярод вядучых матываў фігуруе «прымальны ўзровень якасці» (45%) і даступнасць кантрафактнай прадукцыі для набыцця ў месцы, дзе пражывае рэспандэнт (37%).

Сярод прычын усвядомленай адмовы ад кантрафакту найбольш важным для рэспандэнтаў матывам выступае яго нізкая якасць у параўнанні з арыгінальнай прадукцыяй (64%). Таксама на адмову ад набыцця падробак аказвае ўплыў негатыўны вопыт набыцця і выкарыстання кантрафактнай прадукцыі ў мінулым (29%) і прынцыповая ўстаноўка рэспандэнтаў на адмову ад набыцця і эксплуатацыі падробак (25%). Дарэчы, толькі каля 6% апытаных заявілі пра падтрымку такім чынам аўтара і яго правоў.

Даволі супярэчліва выказваліся рэспандэнты і наконт абароны інтэлектуальнай уласнасці. З аднаго боку, 63% удзельнікаў апытання лічаць, што неабходна прымаць меры па абароне інтэлектуальнай уласнасці. Крыху менш за палову рэспандэнтаў таксама адзначылі, што правядзенне спецыялізаваных семінараў і заняткаў па абароне інтэлектуальнай уласнасці неабходнае ў сучасных рэаліях (48%), аднак толькі 23% з апытаных маладых людзей сёння гатовыя наведваць семінары падобнага роду.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

#ІМХО

Рызыка ці камфорт?

Сістэмы камп'ютарнай бяспекі апошнім часам актыўна падвяргаюцца крытыцы. І быццам бы па справе — то хакеры здолелі ўзламаць самы папулярны электрамабіль Tesla, дыстанцыйна прымусіўшы машыну тармазіць, зачыняць багажнік і складваць бакавыя люстэркі, то ў сеціва трапляе інфармацыя пра пасажыра самалёта, які падключыўся да забаўляльнай сістэмы пасажырскага самалёта Boeing і прымусіў адзін з рухавікоў пачаць набіраць абароты... Ды што там тэхніка — расійскіх хакераў абвінавачваюць ва ўмяшанні ў ход перадвыбарчай кампаніі ў ЗША. А гэта, між іншым, краіна, у якой сканцэнтраваны ўсе найноўшыя распрацоўкі ў сферы бяспекі даных. «Лабараторыя Касперскага» ўвогуле прагназуе падзенне цікаўнасці да сацыяльных сетак у 2017 годзе з-за павелічэння колькасці кібератак і ўцечак асабістай інфармацыі карыстальнікаў.

З аднаго боку, небяспека насамрэч сур'ёзная. Камп'ютарныя тэхналогіі шырока выкарыстоўваюцца практычна ва ўсіх сферах. Алгарытмы кіруюць вытворчасцю, фінансамі і нават элементамі абароны цэлых краін. У быце нікога ўжо не здзівіш электрамабілямі, «разумнымі» гадзіннікамі ці «разумным» домам. Але ўсе яны ў выпадку атакі хакераў з «разумных» могуць ператварыцца ў небяспечныя, а пра ўмяшанне ў сістэмы кіравання зброяй і казаць няма чаго. Дык, можа, сапраўды наспеў час адмовіцца ад празмернага выкарыстання высокіх тэхналогій?

Вядома, рызыка будзе існаваць заўсёды, але не вяртацца ж з-за яе ў каменны век?

З іншага боку, усе, хто крычыць пра небяспеку электронных сістэм і падлічвае колькасць тэхнічных яе збояў, чамусьці не задумваюцца, колькі чалавечых жыццяў за апошнія гады было выратавана дзякуючы аўтаматыцы. Узяць тую ж авіяцыю. Цяпер самалёты літаральна нашпігаваныя электронікай, якая ў большасці выпадкаў здольная нівеліраваць чалавечы фактар і папярэдзіць аварыю. Напрыклад, адной з распаўсюджаных праблем пры пасадцы паветраных суднаў у ранейшыя часы была нізкая бачнасць. Але існуючыя сістэмы аўтаматычнага прызямлення дазваляюць паспяхова садзіцца, нават калі чалавек бяссільны. Уявіце, колькі трагедый не здарылася, дзякуючы гэтаму.

Паўсюдная аўтаматызацыя адкрывае перад намі проста неверагодныя магчымасці. Ужо некалькі гадоў шэраг амерыканскіх кампаній і ўніверсітэтаў тэсціруе сістэмы аўтаматычнага кіравання аўтамабілямі. Машыны без кіроўцаў, якія стварыла кампанія Google, «наматалі» па дарогах ЗША ўжо дзясяткі тысяч кіламетраў і трапілі толькі ў адну аварыю. Здагадайцеся з трох разоў, хто быў вінаваты ў тым ДТЗ? Вядома, чалавек. Калі ўявіць сабе, што ўсе машыны стануць «беспілотнымі», пра гібель людзей на дарогах можна будзе, фактычна, забыць.

Але што рабіць са збоямі ў электроніцы ці ўмяшаннем у яе работу праслаўтых хакераў? Любая праграмная хіба ці «пралаз», якім могуць скарыстацца нядобрасумленныя людзі, выпраўляецца і закрываецца за вельмі кароткі час. Некаторыя вытворцы «софту» нават маюць спецыяльныя праграмы: тыя, хто знайшоў падобныя праблемы і паведаміў пра іх, заахвочваюцца фінансава. Вядома, рызыка будзе існаваць заўсёды, але не вяртацца ж з-за яе ў каменны век?

Я ўжо даволі доўгі час прынцыпова амаль не карыстаюся папяровымі грашыма. Усе фінансы трымаю на картцы, не баюся злодзеяў, імгненна аплачваю ўсе паслугі і не стаю ў чэргах. Свае фотаздымкі і важныя файлы захоўваю не на фізічных носьбітах, а ў «воблаку» і не хвалююся, што разам з тэлефонам ці вінчэстарам страчу дарагія для мяне ўспаміны. Тое самае і з музычнай калекцыяй — усё песні любімых выканаўцаў набываю ў сеціве і магу слухаць іх паўсюль, дзе ёсць інтэрнэт. Так, ёсць дробны шанц, што грошы трапяць да махляроў, а фота ўкрадуць хакеры (зрэшты, нічога цікавага там не знойдуць). Але асабіста я гатовы плаціць за камфорт і зручнасць невялікай рызыкай. А вы?

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

«Першую сукенку пашыла ў 11»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Карыстацца швейнай машынкай Аляксандру навучыла мама. А ў 12 гадоў школьніца пайшла на складаныя курсы кройкі і шыцця. «Мне прыйшлося яшчэ ўгаворваць, каб яе ўзялі, даказвала, што дзіця не з нуля пачынае», — успамінае Алена.

Як толькі ёсць вольны час, Аляксандра замалёўвае ідэі і шые адзенне. Увечары можа паскардзіцца, што няма чаго надзець у школу, і ўжо назаўтра ідзе на заняткі ў новай сукенцы. Нескладаную рэч — тыя ж штаны, спадніцу — дзяўчына паспявае зрабіць за чатыры гадзіны. Апошняе, што пашыла для сябе, — камізэлька з фіялетавага аксаміту пад пінжак.

Любімыя Сашыны дызайнеры — Вячаслаў Зайцаў, Карл Лагерфельд, Како Шанэль, Дэні Дзюран. Знаёмства з вядомымі куцюр'е вельмі ўплывае на яе творчасць. Так, пасля сустрэчы з Дзюранам (калі ён прадстаўляў калекцыю святочных сукенак у Мірскім замку) дзяўчына стварыла свае першыя вячэрнія ўборы.

Аляксандра ўвечары можа паскардзіцца, што няма чаго надзець у школу, і ўжо назаўтра ідзе на заняткі ў новай сукенцы.

Аляксандра, як аказалася, умее ўгадваць тэндэнцыі. Пару гадоў таму яна захацела пашыць ранец. Выбрала тканіну ў вельмі дробную клетку (хоць мама адгаворвала: ёй матэрыял не спадабаўся). З яе, акрамя ранца, дзяўчына зрабіла яшчэ доўгую спадніцу, гальштук-бабачку і пульсэткі. Літаральна праз некалькі тыдняў убачыла паказ Шанэль: у новай калекцыі тканіна была адзін у адзін, як у яе! А на мадэлях — даўгія спадніцы, пульсэткі і сумкі ў колер адзення.

І гэта не адзінае Сашына пападанне. Быў яшчэ пінжак з цёмна-фіялетавай тканіны ў палоску, як у Раберта Кавалі, лёгкае паліто ў ружы — праз год падобнае выпусціў на подыум брэнд Dolce&Gabbana. Што будзе ў модзе гэтай вясной, Аляксандра яшчэ не задумвалася. Але цяпер яна працуе з карункамі — верагодна, іх і варта ўзяць на заметку модніцам.

СТРОІ ДЛЯ КРЫТЫКА

Удзельнічаць у конкурсах і паказах Аляксандра пачала год таму. Пашыць калекцыю, аплаціць праезд, пражыванне, а часам і сам удзел — зразумела, усё гэта патрабуе фінансавых затрат. Але мама школьніцы ўпэўнена: конкурсы патрэбны для развіцця.

— Калі бацькі разумеюць, што расце чэмпіён, ім ужо няма куды дзявацца, яны абавязаны яго ўсюды прадстаўляць, наймаць добрага трэнера. Так і тут. Проста так ты не паставіш сабе задачу зрабіць нешта складанае і эфектнае. Будзеш шыць звычайныя маечкі. Конкурсы — гэта практыка, карысныя знаёмствы, — лічыць Алена.

Пасля паказаў калекцыі не прадаюць. Усе ўборы Саша з мамай носяць па чарзе.

— А мама капрызны заказчык?

— Яна строгі крытык, — усміхаецца школьніца. — Калі нешта будзе зроблена няякасна, абавязкова ўкажа на памылкі. Хочацца ўразіць яе, таму ўдасканальваюся.

Самой Аляксандры падабаецца класічны стыль. Калі пытаюся, якая з пашытых рэчаў любімая, кажа, што ўсе. «Як толькі трэба некуды выходзіць увечары, нават не ведаю, што надзець». У крамах дзяўчына набывае толькі звычайныя майкі і джынсы, на пашыў якіх ёй не хочацца марнаваць свой час.

— А я ўжо год не купляла сабе ніводнай сукенкі і блузкі, — дадае Алена. — У мяне ўвесь час пытаюцца: «Гэта Сашка пашыла?» Летам яна для мяне зрабіла вельмі прыгожую паўсядзённую сукенку — напэўна, знаёмыя кожны дзень мяне ў ёй бачылі. А для мяне гэта яшчэ і нагода пахваліцца дачкой.

Цяпер Аляксандра думае над новай калекцыяй. Плануе прадставіць яе ўжо вясной. Падрабязнасцяў юны дызайнер не раскрывае, але абяцае ўсіх здзівіць.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
16 02 2017 г.

Заўсёды побач

ГАЛАВА — ПА ЧАРЗЕ

Так заведзена ў сям'і вытворцаў сыру

«Дома кіруе муж, а на прадпрыемстве я. Вось і атрымліваецца раўнавага!» — усміхаецца майстар Кобрынскага масларобна-сыраробнага завода Таццяна АПАНОВІЧ. Дзяўчына прызнаецца, што з радасцю памянялася б ролямі, — важная пасада на адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў горада адымае ў яе нямала часу. Таму дзецьмі займаецца пераважна іх бацька Вадзім, які працуе на гэтым жа заводзе рабочым. Увогуле ж, значных мінусаў у тым, што сям'я не разлучаецца нават на рабоце, яна не бачыць.

КАЛІ ПРЫСПЕЎ ЧАС...

— Я родам з Іванава, гэта зусім непадалёк ад Кобрына, — расказвае Таццяна. — Пасля школы паступіла ў Пінскі дзяржаўны аграрны тэхналагічны каледж. Чаму выбрала такую прафесію? Вельмі люблю згушчонку! А калі сур'ёзна, не бачыла сябе на ніякай іншай рабоце — з дзяцінства вызначылася, што буду працаваць у гэтай сферы. Вучылася амаль чатыры гады, мяне гэта па-сапраўднаму захапляла. Мы часта наведвалі профільныя прадпрыемствы ў Брэсце, Бярозе, Століне, іншых гарадах. Сюды ж упершыню трапіла, калі праходзіла практыку на трэцім курсе. Тады цэх яшчэ размяшчаўся ў старым будынку, але завод мяне ўсё адно ўразіў. Вельмі спадабаўся калектыў, падыход да працы. Ды і заробкі былі нядрэнныя нават у практыкантаў. Таму вырашыла: «Абавязкова прыйду сюды працаваць!»

«Спачатку, можа, было цяжкавата працаваць разам, а цяпер прывыклі. На першым этапе здымалі жыллё, потым атрымалі крэдыт і набылі кватэру».

Але першая спроба трапіць у Кобрын пасля заканчэння вучобы аказалася няўдалай, бо ў дзяўчыны зусім не было досведу. Акрамя таго, яе не маглі забяспечыць жыллём. Маладыспецыяліст адправілася на малаказавод у родным Іванаве, дзе займалася вытворчасцю тварагу. Праз восем месяцаў прагучаў чаканы званок з Кобрына...

Таццяна пачынала працаваць у лабараторыі, дзе займалася аналізамі гатовай прадукцыі, а праз год (калі пабудавалі новы цэх) аказалася на цяперашняй пасадзе. Найбольшую частку працоўнага часу яна праводзіць у так званым падвале, дзе кіруе працэсам даспявання сыру. Пад яе наглядам тут працуюць каля сарака чалавек. Таксама ў зоне адказнасці майстра — кантроль адгрузкі гатовай прадукцыі на экспарт, пераважна ў Расію.

...ЦЯПЕР ДАСПЯВАЕ ПРАДУКЦЫЯ

Працэс вырабу прадукцыі пачынаецца з так званых сыравыгатаўляльнікаў — спецыяльных ёмістасцяў, дзе ў малако дадаецца закваска і іншыя кампаненты. Праз некаторы час пры дапамозе бактэрый у іх утвараецца сырнае зерне, з якога фармуюцца галовы. Іх размяшчаюць на спецыяльныя стэлажы і пагружаюць у басейны з расолам. Тэрмін салення залежыць ад гатунку. Пасля заканчэння працэсу прадукт адпраўляюць на даспяванне ў падвал — тое месца, дзе адбываецца апошняя стадыя прыгатавання сыру.

Цвёрдыя гатункі (іх яшчэ называюць элітнымі) спеюць дастаткова доўга — да 180 сутак. Акрамя таго, такія сыры пакрываюць спецыяльнай харчовай фарбай, якая выступае ў ролі натуральнай упакоўкі. Паўцвёрдыя гатункі даходзяць да кандыцыі ў сярэднім за 25—30 сутак.

— Хоць у Іванаве я займалася пераважна тварагом, упершыню сутыкнулася з вытворчасцю сыра менавіта там, — прызнаецца Таццяна. — На прадпрыемстве выраблялі брынзу. Фактычна тады я і зразумела, што гэта найбольш цікавы для мяне кірунак. Некаму гэта можа падацца простым: зварыў сыр, рассартаваў па ўпакоўках — і прадавай. Але гэта не так. Трэба ўважліва сачыць за тэмпературай у памяшканнях, вільготнасцю і іншымі паказчыкамі, бо ўсё гэта адбіваецца на смаку прадукцыі. Тут няма нічога малазначнага. А яшчэ скажу, што работа не сумная і не аднастайная, таму змены праходзяць вельмі хутка. Самае цяжкае ў прафесіі — гэта стасункі з людзьмі. Для ўсіх добрым не будзеш (а я лічу — і не трэба). Але я імкнуся быць да ўсіх падначаленых справядлівай.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

А ЛЕПШАЕ «ХОБІ» — ДЗЕЦІ

— З Вадзімам мы пазнаёміліся яшчэ ў Пінску, вучыліся ў адной групе, — успамінае Таццяна. — Адразу заўважыла яго... Праўда, пасля вучобы ён адправіўся служыць у войска, а калі вярнуўся, я была ўжо ў Кобрыне. Таму, лічыце, перацягнула яго за сабой. Спачатку, можа, было цяжкавата працаваць разам, а цяпер прывыклі. На першым этапе здымалі жыллё, потым атрымалі крэдыт і набылі кватэру.

На прадпрыемстве Вадзім займаецца дробнай фасоўкай прадукцыі. Завод пераважна прадае сыр вялікімі партыямі і, адпаведна, цэлымі галоўкамі. Але некаторыя гандлёвыя сеткі просяць адразу дзяліць яго на больш дробныя кавалкі. Для гэтага тут усталявана спецыяльная лінія, на якой і працуе малады чалавек. Работа, паводле яго слоў, збольшага механічная, але ўсё адно патрабуе пэўнай кваліфікацыі і ведаў.

— Ці складана працаваць пад кіраўніцтвам жонкі? — задумваецца Вадзім. — Ды не, мы абое неканфліктныя, таму цяжкасцяў няма. Субардынацыю захоўваем, не прыслухацца да майстра я не магу. Скажу адно — пра работу дома мы не размаўляем. Што датычыцца вольнага часу, то наша «хобі» — двое сыноў, увесь адпачынак праводзім з імі.

Жыць у невялікім горадзе сям'і Апановічаў падабаецца. Па іх словах, у Кобрыне ўтульна: горад невялікі, але прыгожы, праз дарогу ад дома — парк. Усё ёсць: супермаркет, шматлікія секцыі для дзяцей (старшы сын, напрыклад, ходзіць на кудо — папулярны від усходніх адзінаборстваў), месцы для адпачынку. А калі чагосьці і няма — зусім побач Брэст.

— Якога лёсу хацелі б для сваіх дзяцей? — перапытвае Таццяна. — У першую чаргу, я лічу, трэба займацца любімай справай. Гэта вырашае ўсе іншыя праблемы: калі хочацца працаваць, то і грашовыя пытанні, і любыя іншыя ці здымаюцца, ці адыходзяць на другі план. Мяркую, што ў нас з Вадзімам атрымалася менавіта так.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*
Мінск — Кобрын — Мінск.

З поўначы на поўдзень

НА ПРАЦЫ, ЯК ДОМА

Урачы Буракоўскія пра ролю месца ў жыцці

Калі бацька — акушэр-гінеколаг, маці — тэрапеўт, а брат — судмедэксперт, выбар прафесіі напрошваецца сам сабой. У выніку Міхаіл БУРАКОЎСКІ паступіў вучыцца на неўролага ў Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт. Пасля атрымаў размеркаванне ў Буда-Кашалёва.

Разам з Міхаілам на Палессе паехала віцяблянка Юлія. Маладыя людзі пажаніліся, калі былі яшчэ аднагрупнікамі.

— Міхаіл родам з Гомеля, ён гэтыя мясціны хоць мімаходзь, але бачыў. Я напачатку хвалявалася, бо, калі доўга жывеш у адным месцы, у цябе ўстанаўліваецца свой лад жыцця: пастаянна бачышся з сябрамі, знаёмымі, лёгка арыентуешся. А тут трэба было наладжваць стасункі наноў, мяняць поўнач краіны на поўдзень, — прызнаецца Юлія.

У цэнтральнай раённай бальніцы маладых урачоў чакалі. Кожны год на Буда-Кашалёўшчыну прыязджаюць прыкладна 140—150 выпускнікоў. І медыцынская адукацыя — у тройцы самых запатрабаваных вакансій на раёне.

Юлія са сваёй спецыяльнасцю «урач-кардыёлаг» наогул аказалася першым работнікам такога профілю, які прыехаў на пастаяннае месца працы ў Буда-Кашалёва. Праўда, напачатку пацыентаў было няшмат. Можа, з-за таго, што патрэбны быў час, каб хворыя даведаліся пра новую магчымасць; можа, з-за таго, што да работы прыступіла летам, калі людзі болей занятыя агародамі, чым візітамі ў паліклініку. Але потым навіна разляцелася, і жыхары горада і вёсак пайшлі правяраць сваё здароўе. Колькасць наведвальнікаў хутчэй радуе «сардэчнага доктара», чым напружвае.

— Калі раней былі адносіны накшталт «ну, падумаеш, дробязь — парушэнне сардэчнага рытму», то цяпер людзі стараюцца не запускаць хваробу. Я гутару з пацыентамі, тлумачу, як гэта важна — своечасова абследавацца, клапаціцца пра сябе, і бачу, што ў вачах ужо з'яўляецца зацікаўленасць.

На пытанне пра «вечнахворых» пацыентаў, якія любяць сядзець у чэргах і скардзіцца не толькі на хваробы, але і на жыццё, Юлія адказвае са спакойнай разважлівасцю. Нават без фізічнай хваробы чалавек можа пакутаваць ад адзіноты. Усіх трэба лячыць: каго таблеткамі, а каго — клопатам і ўвагай.

— Уявіце, жыве ў вёсцы якая-небудзь адзінокая бабулька, вакол нікога няма, можа, акрамя двух-трох суседзяў. А паход у паліклініку — гэта і нагода выбрацца ў горад, і магчымасць пагутарыць з людзьмі ў чарзе, можа, нават сустрэць знаёмых. Мы такіх пацыентаў ведаем, любім і сябруем з імі, — падтрымлівае жонку Міхаіл.

Калі малады спецыяліст шукае для сябе жыллё, то, напэўна, хоча, каб яно аказалася бліжэй да месца работы. У выпадку з сям'ёй Буракоўскіх — ад інтэрната да бальніцы адлегласць... у некалькі крокаў. Можна сказаць, што маладыя людзі жывуць на рабоце.

Калі ў Буда-Кашалёве будавалі медыцынскую ўстанову, праект абяцаў быць маштабным. Аднак пасля аказалася, што частка пакояў пустуе, і, каб памяшканні не прападалі, кіраўніцтва бальніцы вырашыла аддаць адно крыло будынка пад жыллё для персаналу. Унутры «аднапакаёвая кватэра» ўтульна абстаўлена і ад звычайнай не адрозніваецца.

— Калі мы толькі прыехалі, мэбля тут ужо была: ложкі, стол, крэслы. Паклеены шпалеры, — расказвае Юлія. — На кухні адразу ўсталяваныя ракавіна, шафы, пліта. Разам з мужам прывезлі халадзільнік, які служыў нам яшчэ ў студэнцкія гады, купілі тэлевізар. Нядаўна дамовіліся з суседзямі правесці кабель, каб падключыцца да хуткага інтэрнэту. Дарэчы, побач жывуць такія ж маладыя людзі, яны нават прыехалі сюды з намі ў адзін год. Так што агульную мову знайшлі без цяжкасцяў, цяпер сябруем, дапамагаем адзін аднаму. Старэйшыя калегі таксама не адмовяць, калі патрэбна кансультацыя па рабоце ці звычайная жыццёвая дапамога.

Па вечарах жыхары інтэрната збіраюцца разам, гуляюць у інтэлектуальныя, настольныя гульні. Вядома, у раённым цэнтры забаў не так многа, але і тут можна знайсці любімы занятак. Юлія цікавіцца манікюрам, хобі Міхаіла даўно стаў гумар, хлопец сочыць за жартамі, піша сцэнарыі для камандаў КВЗ. Не так даўно сямейная пара пераўвасобілася ў Дзеда Мароза і Снягурку, каб павіншаваць дзяцей супрацоўнікаў...

Кіраўніцтва бальніцы вырашыла аддаць адно крыло будынка пад жыллё для персаналу. Унутры «аднапакаёвая кватэра» ўтульна абстаўлена і ад звычайнай не адрозніваецца.

Зрэшты, калі нечага не хапае, можна зазірнуць у кавярню ці кінатэатр або пагуляць у зялёнай зоне. Але наколькі праца ў райцэнтры спрыяе прафесійнаму росту? Па словах Міхаіла, і працэс лячэння, і медыкаментознае забеспячэнне ў бальніцы не адрозніваецца ад таго, што можна атрымаць у Мінску. А прафесійна ўдасканальвацца можна ўсюды. Тое, кім ты станеш, залежыць толькі ад цябе, а не ад месца, на якім ты працуеш...

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by
Мінск — Буда-Кашалёва — Мінск.

Небяспечны азарт

ГУЛЬНЯ НА ВЫБЫВАННЕ, ці Аўтаматы шчасце не выдаюць

Разуменне таго, што ты залежны ад «аднарукага бандыта», прыходзіць, у лепшым выпадку, калі ў кішэнях «гуляе скразняк», а ў горшым — пасля падпісання дакументаў аб перадачы сваёй кватэры за даўгі. Як усё гэта адбываецца ў жыцці, нам расказаў заўсёднік гульнявых клубаў Аляксандр. Калі ўсё здарылася, яму было 34 гады, ён працаваў гандлёвым прадстаўніком, экспедытарам...

— Ведаеце, у такія месцы мала хто прыходзіць гуляць, каб атрымаць задавальненне. Для гэтага больш падыходзіць казіно. З аўтаматамі крышку іншая гісторыя. «Мы» прыходзім сюды з надзеяй хоць крышку зарабіць. Хто на падарунак каханай, хто на яшчэ колькі «падыходаў» да аўтаматаў. У кожнага свае матывы, але гэта, хутчэй, не задавальненне ад працэсу гульні, — гаворыць суразмоўца. — Наконт таго, ці можна сапраўды выйграць грошы: і так, і не. У большай палове выпадкаў аўтамат «дае» выйгрыш. Здавалася б, ну выпала табе шчасце, забірай грошы і ўсё — мэта дасягнутая, ты «зарабіў». Але з гэтых шчасліўчыкаў з поўнымі кішэнямі ідуць дадому адзінкі (і тое, хутчэй за ўсё, не дадому). Віною таму чалавечая сквапнасць.

Атрымліваецца прыкладна так: ты «ставіш» дзесяць рублёў; аўтамат дазваляе выйграць сем; кіруючыся тым, што грошы яшчэ ёсць і яны невялікія, ставіш і гэтыя сем; аўтамат аддае пятнаццаць; ставіш і іх; атрымліваеш пяцьдзясят (тут, здаецца, можна і спыніцца, забраць грошы і пайсці); разважаеш, што раз ужо ёсць пяцьдзясят, то можа быць і сто — ставіш пяцьдзясят; аўтамат «зжырае» іх усе — і «развітальна махае рукой».

Пасля гэтага, як правіла, з'яўляецца жаданне вярнуць сабе хоць бы дзесяць рублёў, з якімі ты прыйшоў. Ставіш пяць рублёў; праз колькі хадоў, падобных на вышэйапісаныя, ты ужо «маеш» трыццаць і пачынаюцца разважанні: «Трэба вярнуць тыя пяцьдзясят, што я выйграў (нягледзячы на тое, што ні разу ў руках гэтыя грошы не трымаў, заўсёды здаецца, што яны твае па справядлівасці)»; ставіш трыццаць — аўтамат «аддае» семдзесят. Хвіліну назад, прыгадаем, ты быў згодны і на дзесяць, а ўжо разлічваеш на сто пяцьдзясят...

«Гульняману перш-наперш неабходна ўсвядоміць факт наяўнасці залежнасці і захацець яе пераадолець. У большасці выпадкаў неабходна звяртацца па дапамогу да спецыяліста».

— І гэта бясконцы працэс. Калі заканчваюцца грошы, ты ідзеш пазычаць у каго заўгодна. Нават пад вялікі працэнт. Я такім чынам застаўся без кватэры... Як сёння памятаю свой першы візіт у клуб. Мы святкавалі дзень нараджэння сябра. Было ўжо позна, а кругласутачных устаноў у Мінску не так ужо і шмат. Вось і вырашылі зайсці ў залу гульнявых аўтаматаў — усяго на пару хвілін. Хочацца падкрэсліць, што я быў цвярозы. Паназіраўшы за гульнёй, мы вырашылі паспрабаваць адзін разочак. Нездарма кажуць, што пачаткоўцам шанцуе: я зарабіў трыццаць рублёў, паставіўшы «дваццатку». Пасля гэтага выпадку я і забыўся пра аўтаматы, — прыгадвае Аляксандр. — Праз два месяцы мы з жонкай разыходзіліся. Я вырашыў пакінуць ёй кватэру, а ўзамен атрымаў дазвол бачыцца з сынам раз у тыдзень. А ў яго якраз праз два дні дзень нараджэння. Грошай у мяне засталося не вельмі многа (прыйшлося набыць сабе аднапакаёвую кватэру). А падарунак павінен быў быць шыкоўным! Тут я і ўспомніў пра аўтаматы. Мне зноў пашанцавала своечасова спыніцца і застацца пры грашах. Гэта быў другі і апошні раз, калі мне так пашчасціла.

У далейшым Аляксандр, прыходзячы ў залу, больш пакідаў грошай тут, чым прыносіў дадому. Але не адчуваў гэтага, таму што, нягледзячы на іх памер у параўнанні з першапачатковай сумай стаўкі, гэтыя грошы былі «з аўтаматаў», а значыць, ён выйграў! Так пакрысе знікалі ўсе зберажэнні. Былі і выпадкі, калі выйгрыш перавышаў пачатковую суму, але на агульным фоне гэта не адбівалася.

— Часам я знаходзіўся ў зале толькі таму, што не хацеў ісці дамоў і сумаваць там у адзіноце. Да таго часу «на аўтаматах» я завёў шмат «сяброў». І прыходзіць туды было яшчэ больш прыемна: ты ўсіх ведаеш, усе ведаюць цябе. Але ад такіх знаёмстваў вялікага дабра не было, — працягвае Аляксандр. — Сярод якасцяў майго характару пачалі праглядвацца дрэнныя. Я пачаў зайздросціць ігракам, якім пашанцавала больш, чым мне. Нават не памятаю, якой велічыні рабіў стаўкі, каб выйграць больш, чым яны. Але ў аўтаматаў заўсёды свае «планы», таму я ніколі не аказваўся «ў плюсе».

Між тым не ўсё ўпіраецца ў грошы. Колькі асалоды, страху і жадання ў тым моманце, калі коціцца шарык электроннай рулеткі ці калі круціцца барабан аўтамата! Таму і прыемна было пракручваць барабан зноў і зноў. Карацей кажучы, «накруціў» я на 120 тысяч долараў. Зараз не маю ні грошай, ні кватэры, ні сяброў (з імі я разарваў адносіны, каб не слухаць вечнае «хопіць гуляць, гэта хвароба»). Аднеквацца ад таго, што гэта і сапраўды хвароба, нельга. Але я, хоць на гэта і спатрэбіўся год, прызнаю сябе хворым. Таму што амаль упэўнены: як толькі з'явяцца грошы, панясу іх «скормліваць» аўтаматам зноў.

Аляксандр кажа, што большасць цяпер, напэўна, асуджаюць яго за адсутнасць сілы волі, легкадумнасць і ўпэўнены ў тым, што яны ніколі б не апынуліся ў такой сітуацыі. «Яшчэ нядаўна я быў бы сярод іх. Але не трэба думаць, што кожны зможа спыніцца пры першым выйгрышы...»

Сітуацыю каментуе кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт і практыкуючы псіхолаг Вольга КАЛАМІНСКАЯ:

— У гульнявой залежнасці, як і ў любой іншай асобаснай паталогіі, ёсць свае прычыны. Існуе цэлы шэраг праблем, здольных прывесці да яе. Многія з іх мы назіраем і ў кантэксце гісторыі Аляксандра.

Незадаволены сабой можа быць любы чалавек. Своеасаблівай кампенсацыяй для яго становяцца разнастайныя хобі. Аднак сустракаюцца выпадкі, калі чалавек паглыбляецца ў залежнасць. Гэта можа быць не толькі алкагалізм ці гульняманія, як у згаданым выпадку, але і больш карысныя для чалавека і яго асяроддзя варыяцыі, напрыклад працагалізм.

Карані залежнасці вынікаюць з нізкага ўзроўню самаацэнкі. Любому чалавеку, як асобе, важна ўсведамляць сваю значнасць. Не атрымліваючы порцыю самапавагі ў рэальным жыцці, ён шукае кампенсацыю ў гульні.

У якасці адной з прычын, якая прыводзіць да ўзнікнення гульнявой залежнасці, варта згадаць таксама імкненне чалавека збегчы ад будзённасці, манатоннасці свайго існавання. У гэтым выпадку гульняман шукае менавіта вострыя адчуванні. І атрымлівае іх, паколькі сам працэс і чаканне выйгрышу на псіхафізічным узроўні выклікаюць выкід у кроў гармону задавальнення, якому пасля цяжка знайсці замену. Такія адчуванні можна параўнаць толькі з закаханасцю. Тут назіраецца тая ж дынаміка (выйгрыш, прайгрыш, ізноў выйгрыш), імгненная змена падзей і выкіды адрэналіну.

Адна з самых распаўсюджаных прычын, якія могуць прывесці да ўзнікнення якой-небудзь залежнасці, — гэта стан псіхалагічнага крызісу. Ён можа быць узроставым, сацыяльным ці змешаным. З аднаго боку, чалавек можа выйсці з крызісу намнога больш загартаваным да любых жыццёвых няўдач. Аднак калі крызіс суправаджаецца дэпрэсіўным станам, пачуццем адзіноты, глыбокай незадаволенасцю рэчаіснасцю, то выйсці з яго будзе дастаткова складана. Такая ж сітуацыя і з экзістэнцыяльным крызісам: чалавек губляе сэнс існавання, калі ўжо дасягнуў поспехаў і ў асабістым жыцці, і ў кар'еры. Яму здаецца, што нічога яскравага з ім ужо не здарыцца, і ён пачынае шукаць вострыя адчуванні ў віртуальнай рэальнасці (у гульні).

«Між тым не ўсё ўпіраецца ў грошы. Колькі асалоды, страху і жадання ў тым моманце, калі коціцца шарык электроннай рулеткі ці калі круціцца барабан аўтамата!»

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. №83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 16 февраля по 20 марта 2017 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.20 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. №115

Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

строительства объекта «Строительство группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной». Дом №1 по генплану (2-я очередь строительства)

Информация о застройщике: «Приорбанк» Открытое акционерное общество («Приорбанк» ОАО), зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь 12 июля 1991 г., регистрационный номер 12.

Юридический адрес и местонахождение: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Режим работы: понедельник – четверг с 8^{30} до 17^{30} часов, пятница – с 8^{30} до 16^{15} часов, обеденный перерыв с 12^{30} до 13^{15} часов, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

В течение трех предшествующих лет «Приорбанк» ОАО как заказчик принял участие в строительстве следующих объектов недвижимости:

в 2015 году – «многоквартирный жилой дом №2 по генплану в составе объекта «Строительство группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш – Саблина — Л. Беды — Белинского — Восточной» 1-я очередь строительства, г. Минск.

Информация об объекте строительства.

Цель строительства: исполнение условий заключенного с Минским городским исполнительным комитетом договора от 12 октября 2009 г. №258-Д на реализацию права проектирования и строительства группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

Этапы и сроки реализации объекта строительства: первый пусковой комплекс строительства – жилая часть здания (секция 5, 6, 7, 8) без чистовой отделки, места общего пользования и инженерные помещения технического подполья, технические этажи секций 5, 6, 7, 8, а также помещение товарищества собственников с чистовой отделкой; второй пусковой комплекс строительства – жилая часть здания (секции 1, 2, 3, 4) без чистовой отделки, встроенные помещения (секция 1–8) без чистовой отделки общей площадью 2734,87 квадратного метра, места общего пользования и технические этажи (секции 1, 2, 3, 4) с чистовой отделкой, пристроенная подземная гараж-стоянка с внутренней и наружной отделкой и внутренними инженерными сетями: водоснабжения, ливневой и хозбытовой канализации, отопления, вентиляции, дымоудаления, электроснабжения, освещения, пожаротушения, пожарной сигнализации и оповещения о пожаре, с помещениями двойного назначения, защитными укрытиями общей площадью 6328,54 квадратного метра.

Первый пусковой комплекс строительства: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – июнь 2016 г. (введен в эксплуатацию).

Второй пусковой комплекс строительства: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – май 2017 г.

Государственная экспертиза проектной документации: экспертные заключения от 6 августа 2010 г. №895-15/10 и от 4 февраля 2015 г. №67-15/15, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

Разрешение на производство строительно-монтажных работ: разрешение на производство строительно-монтажных работ от 30 декабря 2016 г. №2-207Ж-001/15, выданное инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску.

Местонахождение объекта строительства: г. Минск, Советский район, в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

Характеристика объекта строительства: жилой дом состоит из 8 жилых секций, из которых 1, 5, 8–10-этажные и 2, 3, 4, 6, 7, 12-этажные. Конструктивная схема здания – монолитный каркас с шагами колонн от 2,3 м до 7,2 м со сплошными плоскими монолитными перекрытиями толщиной 200 мм. Здание с теплым техническим чердаком и техническими надстройками, в которых расположены машинные помещения лифтов и венткамеры подпора воздуха. Под домом запроектировано техническое подполье, в котором размещаются тепловые пункты, насосная пожаротушения, ЛВС. Техподполье имеет три самостоятельных выхода. Высота технического подполья 2,3 м обусловлена возможностью подключения здания к наружным сетям. Общая площадь квартир: однокомнатных от 43,15 до 54,09 кв. м; двухкомнатных от 63,51 до 78,39 кв. м; трехкомнатных от 83,48 до 100,02 кв. м. Количество квартир на этаже – 4. Высота жилого этажа от пола до пола – 3 м. Во всех квартирах запроектировано устройство летних помещений (остекленных лоджий и балконов). В квартирах, расположенных на 6-м этаже и выше, в качестве второго эвакуационного выхода приняты выходы на лоджии и балконы с глухими простенками шириной 1,2 м. На 1-м этаже расположены встроенные административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра с входами со стороны основных транспортных и пешеходных потоков. Для маломобильной группы населения при входах в эти помещения предусматриваются пандусы. Входы в жилье осуществляются со стороны дворовой территории. На первом этаже 8-й секции предусмотрены помещения товарищества собственников. Естественное освещение обеспечивается нормативным удалением дома от прилегающей застройки с учетом инсоляции, а также оптимальным соотношением площадей окон к площадям помещений. Дом оборудован лифтами, мусоропроводом. Кровля плоская с внутренним водостоком. Окна – из ПВХ-профиля с двухкамерными стеклопакетами. Под дворовой территорией предусмотрено размещение подземного одноэтажного гаража-стоянки на 181 машино-место. Объемно-планировочное решение гаража-стоянки предусматривает устройство двух отсеков на 91 и 90 машино-места, разделенные противопожарной преградой с тамбур-шлюзом между ними. Каждый отсек имеет два выезда – один непосредственно наружу, второй – через соседний отсек. Выходы для людей предусмотрены через лестничные клетки и по въездным пандусам. В жилом доме предусмотрена аварийная противодымная вентиляция для удаления дыма при пожаре из коридоров и подача наружного воздуха из шахты лифтов. Вентиляция: в квартирах – естественная; во встроенных помещениях – естественная и механическая. Электроснабжение: разводка электропроводки с установкой электросчетчиков по квартирам и встроенным помещениям. Холодное и горячее водоснабжение: в квартиры и встроенные помещения устанавливаются счетчики холодной и горячей воды, регуляторы давления и устройства пожаротушения. Отопление: в квартирах – двухтрубная система отопления с установкой радиаторов и счетчиков учета тепла для каждой квартиры; во встроенных помещениях – горизонтальная однотрубная система отопления с установкой радиаторов и теплосчетчиков для каждой организации, потребляющей тепло. Телефонизация, радиофикация, телевидение: поквартирная разводка. Внутренняя отделка только мест общего пользования (общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы). Внутренняя отделка жилых помещений и встроенных помещений: стены, потолки, полы — без чистовой отделки. Дверные блоки: наружные – металлические; межквартирные – деревянные; межкомнатные – не устанавливаются.

Количество предлагаемых объектов долевого строительства: второй пусковой комплекс строительства – 22 единицы; 10 машино-мест.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц следующие квартиры второго пускового комплекса строительства: однокомнатные квартиры – 2 единицы; двухкомнатные квартиры – 10 единиц; трехкомнатные квартиры – 10 единиц.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан и юридических лиц 10 машино-мест.

Цены на объекты долевого строительства:

второй пусковой комплекс строительства: стоимость 1 (одного) квадратного метра **однокомнатных**, **двухкомнатных, трехкомнатных** квартир при внесении 30% стоимости квартир (цены договора) в течение месяца с момента заключения договора составляет **2 200** (две тысячи двести) белорусских рублей, оставшиеся платежи равными частями – не позднее мая 2017 года.

Предусмотреть скидки при 100% оплате и установить стоимость 1 (одного) квадратного метра **однокомнатных, двухкомнатных, трехкомнатных** квартир в размере **2 100** (две тысячи сто) белорусских рублей в течение месяца с момента заключения договора.

Стоимость 1 (одного) машино-места составляет **30 000** (тридцать тысяч) белорусских рублей. Первоначальный взнос – 20%. Оставшиеся платежи равными частями не позднее мая 2017 г.

Формирование стоимости квадратного метра вышеназванных квартир производится на основании сводного сметного расчета с учетом затрат застройщика.

Условия оплаты: при заключении договора дольщик вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров, на момент заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата для всех категорий участников долевого строительства составляет не менее 30% от стоимости квартиры (цены договора) и должна быть внесена не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Первоначальный взнос для всех дольщиков составляет не менее 20% от стоимости машино-места (цены договора) и должен быть внесен не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата по договорам создания объекта долевого строительства будет осуществляться в белорусских рублях.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Права застройщика на земельный участок: решение Минского городского исполнительного комитета от 4 декабря 2014 г. №3079 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства объекта». Свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на него от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7546; от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7547; от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7548; от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7550.

Площадь и границы земельного участка: земельный участок площадью 2,2393 га, расположен в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

Элементы благоустройства: комплекс работ по благоустройству включает устройство подъездов, пешеходных связей, установку малых архитектурных форм, озеленение, организацию детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок, площадок для отдыха взрослых.

Количество в строящемся объекте строительства самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода объекта строительства в эксплуатацию: общее количество квартир – 327, в том числе: однокомнатные – 54 единицы; двухкомнатные – 128 единиц; трехкомнатные – 145 единиц. Общее количество встроенных общественно-торговых помещений – 11 единиц. Общее количество машино-мест – 181 единица.

Общее имущество объекта строительства, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта строительства в эксплуатацию и передачи объектов долевого строительства дольщикам: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и вентиляционные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, сантехническое, электрическое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их деятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в собственность дольщиков, если финансирование этих объектов осуществлялось дольщиками, и передаются застройщиком товариществу собственников.

Предполагаемый срок ввода объекта строительства в эксплуатацию: окончание строительства – 9 мая 2017 г.

Договор строительного подряда: договор строительного подряда от 29 декабря 2014 г. №03.01-05/7 заключен застройщиком с ОАО «Стройтрест №35».

Условия приема заявлений и ознакомления с объектом долевого строительства: прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом.1Н, каб. 3. Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и застройщик вправе заключить договор с другим претендентом. Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – Общество с ограниченной ответственностью «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» (ООО «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс»), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3 или по телефону 8 (017) 292 42 19.

КАМІНАР З ПАЖАРНАГА ЗАВУЛКА

Зоркі Ютуба

У аддзеле прапаганды ўсю сцяну займаюць фотаздымкі з вядомымі людзьмі, граматы і дыпломы. Асабліва бабруйскія ратавальнікі ганарацца сваімі спартыўнымі дасягненнямі. Тым больш што ёсць на каго раўняцца. Вядомы спартсмен Андрэй Багдановіч, алімпійскі чэмпіён у веславанні на байдарках і каноэ, у свой час працаваў у Бабруйскім гаррайаддзеле па НС. А колькі творчых праектаў тут рэалізавана! Узяць, напрыклад, поспехі ў кіно. Дзмітрый Сказаў з Уладзімірам Бутко «заснавалі» тэлеканал «Тушылкін» і папулярызуюць яго праз Ютуб. Героі — выхаванцы мясцовых дзіцячых садкоў і школ. Гэтых кінапрэм'ер юныя кіназоркі, іх бацькі і знаёмыя чакаюць не менш, чым навінкі мастацкага кіно.

Поспех у інтэрнэт-прасторы натхніў ратавальнікаў на новыя ідэі. Яны прыдумалі яшчэ адзін кінапраект — «Разважалкі з Тушылкіным». Асаблівасць яго ў тым, што дзеці не толькі спасцігаюць навуку жыцця ў бяспецы, але яшчэ і дарослых вучаць.

— Гэта нешта накшталт пазнавальнага шоу «Вуснамі дзіцяці», — удакладняе Дзмітрый. — Малыя з дзіцячага садка разважаюць пра той жа вогнетушыцель, навальніцу, іншыя прадметы і з'явы. Гэта так займальна, не адарвацца! Цяпер, калі мы нагадваем дарослым пра тое, што яны і так павінны ведаць, дэманструем яшчэ і гэтыя камічныя ролікі. Спрацоўвае лепей, чым павучальныя лекцыі. А галоўнае, лягчэй запамінаецца.

У эфіры «Разважалкі з Тушылкіным»

А яшчэ бабруйчане любяць, калі ратавальнікі дэманструюць свае спартыўныя і творчыя дасягненні. Бо ў гэтай службе працуюць чэмпіёны рэспублікі па варкаўце, альпіністы і нават артысты тэатра песні «Шынанай». Пасля акцый з іх удзелам ахвотных трапіць у аздараўленчы лагер «Мара», над якім шэфствуюць ратавальнікі, няма адбою. Там ёсць добрая магчымасць не толькі весела правесці час, але і сур'ёзна заняцца спортам. Дарэчы, палявы лагер юных ратавальнікаў з Бабруйска 4 гады запар займаў другое месца ў рэспубліцы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Легенды Пажарнага завулка

Будынак аварыйна-ратавальнай часці №1 у Пажарным завулку Бабруйска — адзін з галоўных гістарычных аб'ектаў горада. Яму больш чым 110 гадоў. Менавіта там жыве той самы міфічны прывід. Пакуль ішлі да яго ў госці цераз бабруйскі Арбат, шмат чаго даведалася пра мясцовыя норавы. І нават часткова адчула іх уздзеянне на сабе. Калі б не мае спадарожнікі, засталася б без кашалька, трапіўшы на кручок махляркі. Не адразу разгледзела яе ў бездапаможнай на першы погляд бабульцы. Цэнтр Бабруйска наогул вельмі каларытная частка горада. Тут знаходзіцца рынак з помнікам бабру на ўваходзе, старадаўнія дамы з чырвонай цэглы, шмат маленькіх разнастайных крам. Нездарма расійскія кінематаграфісты так любяць выкарыстоўваць гэта месца для здымак. Тут у свой час ствараліся кінасцэны для вядомага тэлесерыяла «Паляванне на гаўляйтара». І некаторыя ратавальнікі нават падпрацоўвалі ў якасці артыстаў. Магчыма, што і будынак аварыйна-ратавальнай часці №1 неаднаразова трапляў у кадр. Бо ён таксама непадалёк ад рынку. Але ён славуты больш тым, што ў даваенны час частку яго плошчаў арандаваў гарадскі драматычны тэатр. Пад шырокай лесвіцай размяшчаўся «кабінет» дэкаратара, а на другім паверсе была глядзельная зала. Апошнія прыкметы тэатра зніклі ў 90-я гады, калі нарэшце прыбралі заслону, якая калісьці дзяліла прастору паміж сцэнай і глядзельнай залай. Тэатр даўно ўжо з'ехаў, але другі паверх ратавальнікі вырашылі пакінуць для мастацтва. Цяпер тут знаходзіцца карцінная галерэя. Усе яе экспанаты так ці інакш маюць дачыненне да прафесіі ратавальніка. Спадарожнікі паказваюць мне карціну, дзе па даху ідзе камінар. Гэта, аказваецца, і ёсць той самы прывід.



Аляксандр Салдаценка перадаў эпоху стагадовай даўніны.

— Калісьці гэты раён быў сапраўдным пакараннем для нас, — расказвае Уладзімір Бутко. — Вакол стаялі драўляныя пабудовы, і пажары здараліся ледзь не кожную ноч. Жыў тут такі Мішка Бармалей, які вельмі часта прыбягаў да нас ноччу проста ў споднім і крычаў: «Гарым!» Мішка ўжо даўно з'ехаў у іншую краіну, цяпер камінар пакой сцеражэ.

— Добра, што верыце ў наш прывід, — усміхаецца **начальнік пажарнай аварыйна-ратавальнай часці №1 Дзмітрый ГАЎРОНСКІ.** — Шмат хто не верыць, але ён не крыўдзіцца. Гэта наш анёл-ахоўнік. Вельмі добры.

— А чаму менавіта камінар? — Не разумею я, у чым усё ж такі сувязь паміж ратавальнікамі і чалавекам, які чысціць коміны.

Аказваецца, раней такія спецыялісты ўваходзілі ў склад пажарнай часці. Калі коміны ў парадку — пажараў значна менш.

Вобраз міфічнага прывіда або, як кажуць ратавальнікі, анёла-ахоўніка, матэрыялізаваўся на карціне ў 2008 годзе, калі адбыўся конкурс сярод мастакоў-прафесіяналаў. Дзеці адразу ж на ўра прынялі легенду. Гэта як Карлсан, якога ніхто не бачыў, але пра яго ўсе ведаюць. Ратавальнікі ж іх цікавасць падтрымліваюць. Маўляў, чуем, як ноччу пад яго нагамі скрыпяць масніцы. Легенда, але ж сёння ў гэтым раёне сапраўды амаль няма пажараў.

А яшчэ вельмі цікава паглядзець, якой была пажарная часць стагоддзе таму. Такую магчымасць даў таленавіты мясцовы мастак Аляксандр Салдаценка, які з вялікай дакладнасцю стварыў шыкоўную дыяраму. Нават ратавальнікі ў яго з характэрнымі для таго часу вусамі. Гэта быў іх сродак абароны ад з'едлівага дыму. Перад тым як зайсці ў палаючы дом, яны іх намочвалі вадой. Так лягчэй было дыхаць.

Ну, а сімвалам мужнасці і самаахвярнасці для супрацоўнікаў сённяшняй службы і падрастаючага пакалення служыць Мікалай Корань. Яму на выставе прысвечаны цэлы стэнд. Былы франтавік меў два медалі за адвагу — адзін за баявыя дзеянні, другі — за тушэнне пажараў. Для ратавальнікаў ён быў як родны бацька. Калі бачыў, што нехта прамок на пажары, нёс сваё адзенне і прымушаў пераапрануцца, каб той не прастудзіўся. Яго дом стаяў якраз побач з пажарнай часцю. І ён амаль увесь час быў на службе.

У прафесію праз мастацтва

Вось ужо трэці год запар ратавальнікі запрашаюць у карцінную галерэю на выстаўку, прымеркаваную да прафесійнай даты. Ім яе дапамагаюць рабіць выхаванцы дзіцяча-юнацкай узорнай студыі выяўленчага мастацтва «Вясёлка». Гэтыя часам не зусім дасканалыя дзіцячыя творы бываюць вельмі моцнымі па ўздзеянні. Дзмітрый Сказаў згадвае, як адзін малюнак прымусіў кінуць курыць сталага чалавека з амаль 60-гадовым стажам шкоднай звычкі. Унучка намалявала труну, а побач засмучаных родных. Дзеда гэта так кранула, што ён болей не браў цыгарэту ў рукі.

Не менш моцныя па ўздзеянні фота. Яны зроблены на месцах падзей, дзе эмоцыі самі гавораць за сябе. Тут і пажары, і паводкі, і дарожныя аварыі. А яшчэ акцыі, святы, спаборніцтвы. І вельмі часта наведвальнікі пазнаюць на гэтых здымках сябе. Вось нешта малююць маленькія ратавальнікі з 65-га садка, дарэчы, першага ў краіне з адмысловым ухілам. А гэта ўжо вучні 28-й школы, дзе існуе клас МНС. Сёлета яны занялі 1-е месца ў КВЗ па вобласці. Магчыма, нехта з іх праз некалькі гадоў прыйдзе ў Бабруйскі гаррайаддзел па НС ужо ў якасці супрацоўніка. Бо не ўлюбіцца ў гэтую прафесію, пабываўшы ў галерэі, проста немагчыма. Выстаўка працуе да сакавіка. Сумна тут дакладна не будзе. Дарэчы, кажуць, што той, хто дакранецца да карціны з выявай камінара, назаўсёды будзе застрахаваны ад усялякіх няшчасцяў. Галоўнае, не стварацца для іх умовы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

■ Ёсць пытанне

ХТО КВАТЭРАЙ ВАЛОДАЕ, ТОЙ ЗА ЯЕ І ПЛАЦІЦЬ

Мы пабудавалі новую кватэру па дагаворы ўдзелу ў долевым будаўніцтве. Дом здадзены ў эксплуатацыю, і з нас патрабуюць, рабілі адлічэнні на будучы капітальны рамонт, плацілі за тэхнічнае абслугоўванне, жыллёва-камунальныя паслугі. Ці законна гэта, калі мы ў новай кватэры пакуль не жывём (там яшчэ шмат што трэба зрабіць)? І наогул, з якога моманту павінна ўносіцца плата за жыллёва-камунальныя паслугі жыхарамі дамоў, пабудаваных па дагаворах удзелу ў долевым будаўніцтве?

С. Шнітка, *г. Мінск.*

Гэтае пытанне ўрэгулявана арт. 29 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ЖК). Пунктам 2 гэтага артыкула прадугледжана, што абавязак унясення дольшчыкам платы за жыллёва-камунальныя паслугі ў адпаведнасці з дагаворам на аказанне жыллёва-камунальных паслуг узнікае з дня заключэння дагавора, які прадугледжвае перадачу дольшчыку ў валоданне і карыстанне аб'екта долевага будаўніцтва.

Устаноўлена таксама, што адмова ад заключэння дагавора на аказанне асноўных жыллёва-камунальных паслуг не вызваляе дольшчыкаў, якія заключылі дагаворы, што прадугледжваюць перадачу ім у валоданне і карыстанне аб'ектаў долевага будаўніцтва, ад унясення платы за фактычна аказаныя асноўныя жыллёва-камунальныя паслугі.

Акт прыёмкі — перадачы аб'екта долевага будаўніцтва запаўняецца пасля заканчэння будаўніцтва па форме, якая змяшчаецца ў дадатку 3 да тыпавога дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва (зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6.06.2013 г. № 263 «Аб долевым будаўніцтве аб'ектаў у Рэспубліцы Беларусь»).

Аналагічнае правіла па ўзнікненні абавязку ўнясення дольшчыкам платы за жыллёва-камунальныя паслугі змяшчаецца і ў п. 4 Палажэння аб парадку разлікаў і ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылымі памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.06. 2014 г. № 571).

Віктар САВІЦКІ

■ Факт

Welcome у сталічную падземку

Назвы станцый у мінскім метро сталі аб'яўляць на англійскай мове.

У 2014 годзе такое рашэнне прымалася ў сувязі з правядзеннем у сталіцы чэмпіянату свету па хакеі. Як паведамлялася раней, Беларусь з 12 лютага ўвяла пяцідзённы бязвізавы рэжым для грамадзян 80 краін. Ён распаўсюджваецца на 39 краін Еўропы, уключаючы ўвесь Еўрасаюз, а таксама Бразілію, Інданезію, ЗША, Японію і іншыя дзяржавы.

Пастаўлена лагічная кропка ў «маянэзнай» справе

Эканамічны суд Гродзенскай вобласці прыцягнуў ТДА «Фірма АВС» да адміністрацыйнай адказнасці за нядобрасумленную канкурэнцыю, паведаміла прэс-служба Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Згодна з рашэннем судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, дзеянні ТДА «Фірма АВС» па ўвядзенні ў абарот прадукцыі — маянэзу «Провансаль Тот самый вкус!» ва ўпакоўцы, здольнай выклікаць змешванне з таварам — маянэзам «Камако Провансаль Столичный», былі прызнаныя актам нядобрасумленнай канкурэнцыі.

Пастановай Эканамічнага суда Гродзенскай вобласці за здзяйсненне дзеянняў, якія з'яўляюцца ў адпаведнасці з антыманапольным заканадаўствам нядобрасумленнай канкурэнцыяй, юрыдычная асоба прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці на суму ў памеры 400 базавых велічынь (9 200 рублёў). Пастанова суда па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні выканана.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Нефармат

ЗА ПАЎГАДЗІНЫ ДА ВЯСНЫ

У лютым я заўсёды ўспамінаю пастэрнакаўскае: «Февраль. Достать чернил и плакать! Писать о феврале навзрыд, Пока грохочущая слякоть Весною черною горит». Праўда, гэтая «грохочущая слякоть» у асноўным здаралася ў снежні і студзені, а люты нечакана ашчэрыўся цыклонам «Эрыка» на поўдні краіны і заваліў усё наваколле белым-белым снегам. Але мароз трашчаў не надта доўга, стала цяплець. А ўчора былі Грамніцы. Гэта значыць, вясна не за гарамі і лясамі.

Чаму мы так чакаем вясну? Хіба вясною жыць лягчэй, чым зімой? Старыя праблемы застаюцца, з'яўляецца новы клопат: у каго дача ці новая будоўля, у каго змена гардэробу альбо недахоп сродкаў на абновы. Але ж вясной сонца болей, болей надзей і светлых спадзяванняў!

Нават учора ў цырульні давялося ўпэўніцца, што жанчыны ўжо рыхтуюцца да вясны. Я ў гэты салон трапляю рэдка. Вось і гэтым разам мая майстар Алена падхапіла грып ці іншую вірусную інфекцыю і ледзь пазнавальным голасам папрасіла пачакаць тыдзень. Але тыдзень цярпець сваю нягеглую прычоску не хацелася. Пазваніла ў найбліжэйшы ад дома салон, ветлівая адміністратар запісала да майстра Юліі. Юля аказалася маладой прывабнай дзяўчынай, а пра яе дасягненні ў прафесіі сведчылі шматлікія дыпломы на сцяне. Побач працавала Наташа, яркая брунетка пышных формаў, насупраць — з-за макіяжу і выразу твару крыху падобная на ляльку Барбі — Ніна. І было відаць, што кліенткі ў іх пастаянныя. Ды і апошнія паводзілі сябе так, нібы яны не ў цырульні, а ў кампаніі старых знаёмых. Адчувалася, што і працаўніцы індустрыі прыгажосці ведаюць сваіх наведвальніц, даражаць імі, таму з радасцю падтрымліваюць гутарку, стараюцца ўсяляк узняць настрой.

Праз хвіліну пасля мяне ў цырульню зайшла мажная кабета ў цёмным норкавым футры. І ўжо па тым, як адміністратар Эма кінулася яе сустракаць і дапамагаць скідаць шубу, стала зразумела, што Аляксандра Васілеўна — тут кліент жаданы. Эма адразу пабегла рабіць каву для госці, а кліентка тым часам уплыла ў залу і ўселася да Наташы ў крэсла, нібы каралева на трон. На пытанне «Што будзем рабіць?» амаль на ўсю залу прагучала: «А што хочаш, даражэнькая. Толькі каб адсюль я выйшла не мокрай курыцай, а чалавекам». Далей гэтая бізнес-лэдзі, у чым ужо не засталося сумненняў, расказала, што нарэшце пазбавілася ад праверкі.

— Ператрэслі ўсю дакументацыю, чаго толькі шукалі, невядома. І галоўнае, — павышала голас тэмпераментная кліентка, — гэта ў іх цяпер не праверка, маніторынг называецца, што, па сутнасці, адна халера. Не, я на іх не злуюся, яны людзі служывыя, ім загадалі, яны робяць. Я здагадваюся, адкуль вецер падзьмуў. Мой канкурэнт, таму і нядобразычлівец, пастараўся. Адным словам, нічога асаблівага не знайшлі, так, жменю драбязы, але ж нервы патузалі. Лічы, тыдзень увесь калектыў пад напругай, і я, не ведаючы часам, як сябе паводзіць...

У Аляксандры Васілеўны зазвінеў мабільнік мелодыяй Пахмутавай «Белавежская пушча», і яна не скончыла аповед пра «маніторынг» сваёй фірмы адной з кантралюючых арганізацый, а ў тэлефон пасля некалькі дзяжурных фраз амаль закрычала: «Мне не было калі, і не да гэтага, а ты не магла распытаць, як у яе там прайшло, хоць бы падтрымаць яе! Даведаешся — перазвоніш мне!» Потым, звяртаючыся да Наташы, а заадно да ўсіх, пракаментавала званок:

— Сястра стрыечная, вось бесталковая. Я ёй даручала даведацца, як там у Валі прайшла камісія. Валя — наша вясковая сваячка. Б'ецца баба, як тая рыба аб лёд. Дзве каровы, каня ў гаспадарцы трымае, а свіней, курэй — процьма. Тут яшчэ бяда: муж перанёс інсульт. Праўда, акрыяў трохі, дзякуй урачам, але дзе там работу па яго сілах знойдзеш? Здаровых у калгасе не ўсіх бяруць. Па гаспадарцы ёй крыху дапамагае. Нядаўна папера прыйшла з патрабаваннем падатак заплаціць за дармаедства. Я ёй гаварыла, каб брала ўсе даведкі аб перанесеных раней хваробах ды ішла ў камісію, якая вызваляе ад аплаты. Я магла б ёй, вядома, дапамагчы з грашыма. Але якія яны дармаеды? З мазаля жывуць, крыўдна нават. Спадзяюся, што там усё вырашылася добра. Хутка вясна, агарод садзіць трэба, насенне купляць, а не падаткі плаціць.

— А за мяне вось муж заплаціў, — амаль што з пафасам адазвалася з крэсла насупраць кліентка Ніны, нечым падобная на самую Ніну, мініяцюрная маладзіца са старанна нафарбаваным тварыкам. — Працаваць не зусім маё амплуа. А плаціць за ўсё ў сям'і павінен муж, гэта не мае турботы. Мой клопат — выглядаць адпаведна, дом весці, вось і пачынаю рыхтавацца да вясны. Ніначка, я мяняю свой вобраз, сёння робім меліраванне.

Адміністратарка Эма, якая ведае ўсё пра ўсіх, не ўтрывала, калі Ніна павяла кліентку мыць галаву, пракаментавала: «Вой, не хацела б я такога заможнага і гатовага ўсё фінансаваць. Не раз наш візажыст Віка ёй ліхтары пад вокам грыміравала, так бы мовіць, вынікі прафілактычнай работы над выхаваннем жонкі багатага і ўплывовага.

— За ўсё, мае міленькія, трэба плаціць, — адазвалася Аляксандра Аляксееўна, якая прыкметна памаладзела пад рукамі вопытнай Наташы. — Я, напрыклад, у сродках не абмежаваная, але кожны дзень — стрэсы, нервы, сваркі. Вось у цырульні, як ні дзіўна, супакойваюся, таму і люблю сюды хадзіць. Нічога, дзяўчаты, хутка вясна, свята нашае будзе!

...Сапраўды, не так шмат дзён застаецца і да свята. Але пра гэта як-небудзь наступным разам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.27	18.21	9.54
Віцебск —	8.20	18.07	9.47
Магілёў —	8.17	18.11	9.54
Гомель —	8.10	18.11	10.01
Гродна —	8.41	18.37	9.56
Брэст —	8.38	18.41	10.03

Месяц

Апошняя квадра
18 лютага.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Ганны, Івана, Мікалая, Рамана, Сямёна, Уладзіміра, Уласа, Цімафея.*
К. *Дануты, Данізля, Юльяна.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

16 ЛЮТАГА

1758 год — нарадзіўся (в. Скокі, цяпер у Брэсцкім раёне) Юльян Нямцэвіч, пісьменнік, гісторык. У час паўстання 1794 года — ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі. Яго «Гістарычныя падарожжы...» утрымліваюць апісанні Брэста, Гродна, Слоніма, Навагрудка, іншых беларускіх гарадоў. Аўтар мемуараў. Памёр у 1841 годзе.

1892 год — нарадзіўся (в. Выдранка, цяпер у Краснапольскім раёне) Аляксей Сцяпанавіч Кучынскі, беларускі дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Удзельнік Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года, старшыня салдацкага камітэта 7-га інжынернага палка 9-й арміі. У Кастрычніцкую рэвалюцыю быў на Румынскім фронце, старшыня палкавога камітэта. Са снежня 1917-га працаваў у Мсціслаўскім павеце сакратаром валасной ячэйкі, старшынёй павятовага камітэта РКП(б), затым быў камісарам юстыцыі, рэдактарам газеты «Думы бедняка». З 1930 года — намеснік рэдактара газеты «Савецкая Беларусь». З 1933-га — начальнік сектара Наркамцяжпрама БССР, в.а. рэктара БДУ. У 1937 годзе рэпрэсаваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

1893 год — нарадзіўся Міхаіл Мікалаевіч Тухачэўскі, савецкі ваенны дзеяч, намеснік наркама абароны СССР. Маршал Савецкага Саюза (1935). У Грамадзянскую вайну камандаваў арміямі ў Паволжы, на Поўдні, Урале, у Сібіры. Падчас савецка-польскай вайны камандаваў Заходнім фронтам. Аўтар работ, якія аказалі значны ўплыў на развіццё савецкай ваеннай навукі і практыку ваеннага будаўніцтва. У 1937 годзе асуджаны да вышэйшай меры пакарання па абвінавачванні ў здрадзе Радзіме і ва ўдзеле ў так званай «Антысавецкай трацкісцкай ваеннай арганізацыі ў Чырвонай Арміі». Рэабілітаваны пасмяротна.

1902 год — нарадзіўся (в. Бязверхавічы, цяпер у Слуцкім раёне) Рыгор Данілавіч Мурашка, беларускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Прыгранічны манастыр», «Званкі», «Рузікі», раманаў «Сын», «Таварышы» і іншых твораў. У гады Вялікай Айчыннай вайны — удзельнік Мінскага падполля, з 1943-га — у партызанах. Загінуў у 1944 годзе падчас прарыву нямецкай блакады партызан у Лагойскім раёне.

1925 год — нарадзіўся (в. Васілевічы Рэчыцкага раёна) Іван Якаўлевіч Навуменка, беларускі пісьменнік і літаратуразнавец, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, народны пісьменнік Беларусі. У 1973—1982 гадах — дырэктар Інстытута літаратуры АН Беларусі, у 1982—1992 гадах — віцэ-прэзідэнт АН Беларусі, у 1992—2002 гадах — саветнік пры Прэзідыуме НАН Беларусі. Апублікаваў больш за 200 навуковых прац, больш як 80 выдадзеных асобнымі кнігамі мастацкіх твораў. Аўтар раманаў «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці», «Асеннія мелодыі» і інш. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2006 годзе.

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік:
«Радасць перад вялікімі, не пройдзенымі шляхамі ўзвышае і ўпрыгожвае чалавека і вялікім імкненнем поўніць яго».

УСМІХНЕМСЯ

— Я жанчына, а не мыйшчыца посуду.

— Я мужчына, а не банкамат.

На адэскім сайце знаёмстваў:

«Хачу знайсці Аркадзя... Таго, які збег са спаткання і пакінуў мне велізарны рахунак у рэстаране. Вы казёл, Аркадзь!»

Каментарый: «Аркаша! Вы хоць наеліся?»

— Аляксеева, да дошкі!

— Ну чаму я?

— Добра, тады па спісе. Аляксеева, да дошкі!

Чым даўжэй я займаюся боксам, тым больш для мяне загадкавага і незразумелага.

— Я проста спытала мужа, ці памятае ён, які сёння дзень... Спалохаць мужчын так лёгка!

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 683. Нумар падпісаны ў 19.30 15 лютага 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12